Пры грыбах пра гміну ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Белліцэісты журналісты ☞ 8-9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 39 (2837) Год LV | Беласток, 26 верасня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

ПАДЗІВІЦЦА НА ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

Тэкст і фота
Ганны КАНДРАЦЮК

Каля каго чаго патрэшся — сам таго набярэшшся! — вучыць народная мудрасць. Беларускі народ абажае церціся ля добрых і шляхетных людзей. Штосьці зрушылася ў гэтым плане на Беласточчыне. Яшчэ тыдзень да паломніцтва ў Адрынкі ў маёй парафіі разлілася хваля добрай прапаганды. Усе захацелі ехаць у Кудак, да архімандрыта Гаўрыіла:

— *Czy była już w Pustelni?* — спытала мяне Ала, з якой езджу на адным аўтобусе ў царкву.

— Дакладна, пяць раз, — адказалая я.

— *Ale nie zaszkodzi i szósty raz pojechać* — агітавала мая адна парафіянка.

— *Cały Białystok wybiera się. Na osiem autokarów ludzi już zapisało się. Trzeba zobaczyć jak tam ten biedny Gabriel sobie radzi...*

Пра пілігрымку ў Кудак гаварылі нават ля майго блока ў Беластоку. Калі я выйшла ў шэсць гадзін раніцы з хаты, двух дзядзькоў, якія сталі ля магазіна і курылі папяросскі, наракалі на дождж.

— *А так бы селі ў аўтобус і паехалі б у Адрынкі!* — сказаў адзін.

— *Няма як! Вазьмі і паедзь, як туды пэкаэс не ходзіць,* — сумняваўся другі.

Да чаго гэта ідзе! — думала я ідучы лясной дарогай у скіт. — Напэўна воўк якісь у лесе здохне?! Раней не чула каб пра праваслаўныя пілігрымкі гаманілі пад маім магазінам...

* * *

Скіт ва ўрочышчы Кудак каля Адрынок дзейнічае афіцыйна год. За той час паспелі зрабіць кладку, паставілі дом і царкву. Яе залатыя купалы на фоне трыснягу выглядаюць як з казкі. Праўда, царква яшчэ ў пабудове і яе не паспелі, як планаваў год таму архімандрыт Гаўрыіл, асвяціць 15 верасня г.г., у час парафіяльнага свята Антонія і Феадосія Кіеўска-Пячэрскіх. Прыбылы ў Кудак мітрапаліт Сава асвяціў адно драўляны будынак хаткіскіта. Наколькі прыгожы пол не мае права пераступіць парог келлі, мне не пашанцавала пабачыць домік ад сярэдзіны. Затое кожны, хто хацеў, мог паставіць свечку ў новай царкве. Царкоўка, хоць завершана купаламі, пакуль без акон і трывалага даху. Пабудову вядуць майстры-горцы з другога канца Польшчы. Сцены будынка пакладзены на зруб, без цвікоў. Старарускі стыль наклікае настрой часоў хрышчэння Русі. І прамаўляе месца. Царква стаіць ля пакручастага берага Нарвы, сярод балот і трыснягу. Далей — сіняя сцяна пушчы. Народ у наваколлі Нарвы стаў называць архімандрыта Гаўрыіла „экалагічным манахам". Услед мянушцы з'явіліся легенды:

— Раз пад яго хатку ваўкі прыгналіся, — апавядае Ніна з пушчанскай вёскі за рэчкай. — Цэлая зграя. Селі ля келлі і вострацъ зубы. Архімандрыт выйшаў да іх на парог, пагаварыў да іх, памаліўся. Павалакліся тыя ваўчышчы назад у пушчу. Паслухалі нашага Гаўрыіла. Лясная звярына Божае слова зразумела, скарылася. І павалаклася ў пушчу з падагнутымі хвастамі....

У самой Нарве, калі пачулі пра набегі ваўкоў, адрэагавалі больш канкрэтна. Сам войт сеў у машыну, прыехаў да архімандрыта ды абдараваў яго „страшаком" на ваўкоў.

* * *

У Кудак дабіралася я спачатку на рэйсавым аўтобусе, пасля, як шчыры паломнік, рашыла ісці пешшу. Восем кіламетраў. Не давялося. Ужо за паваротам за нарваўскімі могілкамі спыняліся машыны і незнаёмыя людзі прапанавалі падвезці.

— Вы пэўна туды сама што і мы, — запрашалі.

— Так-так, — адказвала я.

— Сядайце, падвязем вас!

— Дзякую, мне хочацца ісці пешшу.

— Ну то як хочаце, — у адказе чулася крыўдлівая нотка. Чалавек спыняецца, хоча добра, а тут — такая дзівачка...

У канцы-канцоў, калі распадаўся дождж, я здалася. Дзесьці за Гарэндамі падабраў мяне з дарогі Георгій з Беластока. Хлапец натуральна гаварыў па-беларуску. Сам ён родам з Каляснога, што непадалёк Адрынок. Раней чым на свята ва ўрочышча Кудак ён спяшаўся ў сваю вёску, каб завезці на фэст сваю маці.

— Дзякуючы айцу Гаўрыілу людзі ажылі ў нас, — кажа хлапец. — А мая маці не даравала б мне, калі б я не звольніўся з работы і не завёз яе ў святое месца.

(працяг будзе)

9 770546 196000

Вайна без правілаў

Хто баіцца вайны, той вечна ваюе. Пры гэтым, як не парадаксальна, чалавек можа быць перакананы, што жыве ў міры, і вайной тут нават і не пахне. Найбольш яскравы прыклад — афганская вайна, якую вёў калісь Савецкі Саюз. Дзесяць гадоў гінулі людзі на той вайне, адмысловыя службы прысылалі бацькам у цынкавых трунах іх загінуўшых дзяцей, на вуліцах сталі з'яўляцца маладыя хлопцы з адарванымі рукамі і нагамі... А ў гэты час КПСС і савецкі народ бясконца славілі сваіх кіраўнікоў, дзякуючы за „мірнае неба над галавой".

„Мы, дзякуючы мудрасці нашага кіраўніцтва, ужо больш за пяцьдзесят год жывём без вайны" — сцвярджалі СМІ тых часоў. „Мы можам і бедна жыць, і нават галадаць, абы вайны не было" — распускаюцца ў сённяшнім беларускім грамадстве думкі.

Толькі вось вайна ў нас на кожным кроку. У нас не збіраюць зерне і не капаюць бульбу. У нас ідзе бітва за ўраджай. Супраць каго ладзіцца бітва, аж казаць смешна. Змаганне ідзе за зерне, за бульбу, і супраць земляроба. Бо гэта ён, земляроб, можа прайграць гэтую вайну. Таму яго трэба кантраляваць і ў выпадку чаго лупцаваць, каб баі мясцовага значэння былі пераможнымі.

Нават калі няма ні пасяўной пары, ні збору ўраджаю, вайна ў так званы мірны час, усядно працягваецца. Улада хоча выйграць вайну ў грамадства. І тут ідуць жорсткія баі з няўрадавымі арганізацыямі, палітычнымі партыямі і ўвогуле ўсякімі праявамі вальнадумства і іншамыслення. І як такі час можна назваць мірным — незразумела. Бо халодная грамадзянская вайна, якую развязала гэтая ўлада, спачатку падзяліўшы суайчыннікаў на простых грамадзянаў Беларусі і свядомых беларусаў, даўно пашырылася да межаў вайны гарачай, калі талерантнае і неагрэсіўнае беларускае грамадства яшчэ раз штучна падзялілі на „прадажных Захаду дэмакратаў" і „лаяльных да ўлады" чалавечкаў.

Ну а выбары — гэта ў Беларусі ўвогуле жахлівая вайна без правілаў, і гэта вайна не на жыццё, а за жыццё. На кандыдатаў ад апазіцыі глядзяць як на камікадзэ, а кандыдат ад улады нязменны і ўсім вядомы. Ён жа і называе апазіцыю „ворагамі народу". І змаганне з „ворагамі" вядзецца па законах ваеннага часу.

Заходнееўрапейскаму жыхару хіба што ніяк не ўцяміць, чаму да выбараў трэба рыхтавацца як да апошняй і рашучай бітвы. Там, у дэмакратычнай і сытай Еўропе, выбары гэта звычайная праца палітыкаў. А для грамадства чарговая мажлівасць адпомсціць пэўным палітыкам за невыкананне абяцанняў, альбо падтрымаць іх за выкананне простым укідываннем адпаведных бюлетэняў у скрынку.

На Беларусі такі сцэнар здаецца ўвогуле нерэальным. І зараз, калі зноў абвясцілі прэзідэнцкія выбары, у грамадства на вуснах толькі адно пытанне. Ці ўстаіць на гэты раз існая ўлада, ці можа цяпер, калі ўвесь свет з ёй сварыцца, яна ўпадзе?

Размова не ідзе нават пра тое, ці будуць гэтыя выбары справядлівымі. Няма гаворкі і пра тое, якімі будуць наша грамадства і наша краіна ў выпадку змены ўлады. Гэта нібыта нікога моцна не цікавіць. І як не дзіўна, на гэты раз не цікавіць большасці людзей нават прозвішча асобы, якая можа скласці канкурэнцыю сённяшняму кіраўніку. Напэўна таму гэтых асобаў апазіцыя набрала каля дзесятка. А народ, звыклы да ваенных дзеянняў у мірны час, народ, які не першы раз прайшоў баявыя выбары, народ, які ведае толк у баявой стратэгіі і разумее логіку тактыкі, зараз стараецца адгадаць, якія баявыя дзеянні будзе рабіць улада, а якія апазіцыя, хто на чый бок пяройдзе ў выпадку ўмяшання байцоў звонку, а хто каму здрадзіць, калі ўмяшання не будзе, і як хутка гэтая вайна (не, не закончыцца), а перарасце ў сусветную.

А яна ўжо перарастае. На тэатры ваенных дзеянняў, пад назвай беларускія прэзідэнцкія выбары, ужо ваююць розныя сілы і з захаду, і з усходу. Таму гэтая вайна прадбачыцца сама жорсткай. І хтосьці з іх, тых ваюючых бакоў з розных куткоў, пераможа. І ў гэтай сітуацыі найбольш важным павінна быць пытанне — ці мае шанцы на выйгрыш у гэтай жорсткай вайне без правілаў мірны і вечна ваюючы беларускі народ.

Віктар САЗОНАЎ

Жыць у страху (2)

Прадбачваецца, што яшчэ ў XXI стагоддзі ў гарадах будзе жыць пад 90% насельніцтва Еўропы і ў такім выпадку працэс кліматычных змен можа яшчэ паскорыцца. Пры кліматычных анамаліях могуць паглыбіцца таксама праблемы галадання значнай колькасці насельніцтва свету. Эрупцыя вялікага вулкана на Філіпінах у 1991 годзе спрычынілася да смерці соцень людзей. Адносна невялікі вулкан, што нядаўна ўспыхнуў у Ісландыі, моцна надакучыў мясцовым жыхарам і спрычыніўся да авіяцыйнага паралічу Еўропы. Калі глянуць комплексна на трагедыі XX і XXI стагоддзя, дзе хіба самыя вялікія людскія ахвяры, дзесяткі мільёнаў людзей гэта паслядоўнасць праўлення камуністычных і фашысцкіх улад, то маецца ўражанне, што такіх вялікіх трагедый і такой вялікай смяротнасці людзей раней не было. Толькі само бежанства 1915 года лічыцца нацыянальнай трагедыяй беларусаў, бо часта нашы людзі паміралі на чужыне або вярталіся з бежанства да спаленых і знішчаных хат і запушчаных палёў. Аднак здаўна нашым продкам прыходзілася жыць у страху перад адмоўным уздзеяннем розных стыхій, бур, паводак і агульнасельскіх пажараў, якія нават дашчэнту нішчылі вёскі, у боязі перад нападзеннем варожых войск або звычайных бандытаў. Людзі ў мінулым апасаліся таксама, а можа і перш за ўсё, заразных хвароб, бо бывала, што пасля іх у вёсках заставаліся пры жыцці толькі адзінкі. Дастаткова прачытаць даўнія малітвы, з якімі вернікі звярталіся да Бога, і знайсці ў іх пералічаныя многія небяспекі, якія найчасцей спасцігалі нашых продкаў. Апрача агульнавясковых катаклізмаў здараліся таксама індывідуальныя трагедыі, калі ў час ваенных ліхалецяў забівалі бацькоў або тыя паміралі і дзеткам прыходзілася выжываць з падтрымкай сваякоў, знаёмых або хадзіць па вёсках і жабраваць. Многія нашы людзі ў мінулым верылі, што маштабныя катаклізмы, індывідуальныя няўдачы, хваробы і смерць блізкіх асоб гэта рэзультат грахоўнага жыцця і трэба іх пакорліва пераносіць. Хаця часта здаралася, што людзі наракалі на свой лёс, то патрапілі ў цяжкі час мабілізавацца і са слязамі ў вачах маліцца, каб Бог стрымаў стыхіі або адхіліў хваробы, смерць і іншыя беды. Вядомыя выпадкі, што пасля супольных агульнавясковых малітваў, калі людзі з іконамі абыходзілі сяло або свае хаты і гаспадарчыя будынкі, вецер суцішаўся і пераставаў перакідваць агонь з аднаго дома на іншы і можна было патушыць пажар. Вядомыя таксама аздараўленні людзей пасля малітваў на Крыначцы, у Старым Корніне і іншых святых месцах. У гэтым годзе на Святой Гары Грабарцы адзначалася 300-я гадавіна выратавання людзей ад эпідэміі, калі нашы продкі масава сабраліся на гары і пасля малітваў да Бога асталіся здаровымі. Псіхолагі і святары розных веравызнанняў, якія памагалі пацярпелым у час сёлетніх паводак і пажараў, тлумачылі, што нельга жыць у вялікім і пастаянным страху перад небяспекамі, што могуць нас ізноў спасцігнуць у будучыні, бо гэта можа моцна пашкодзіць здароўю. Трэба заўсёды з надзеяй глядзець уперад. Святары дадаюць яшчэ, што найлепш аддацца ў Божую апеку. Аднак на практыцы цяжка ажыццяўляць веды з тэорыі, а тым болей пасля цяжкіх перажыванняў, праз якія праходзілі людзі пасля вялікіх пажараў ці паводак.

Аляксей МАРОЗ

Пасля буры, якая 1 жніўня прайшла над Гайнаўкай, засталіся паламаныя дрэвы і залітыя панадворкі і падвалы

Вачыма еўрапейца

Самалёты ці птушкі?

Пабудова аэрапорта непадалёк Беластока ад некалькіх гадоў з'яўляецца прыярытэтным заданнем ваяводскіх самаўрадавых улад. Тлумачыцца з чарговых рашэнняў у гэтай справе падляшскі віцэ-маршалак Багуслаў Дэмбскі. Тлумачыўся, чаму не рашыліся на пабудову аэрапорту ў Тапалянах. Пасля — з праблем з хуткай падрыхтоўкай рапартаў звязаных з падрыхтоўкай яго пабудовы пад Тыкоцінам. У адным з апошніх нумароў тыднёвіка „Палітыка" паявіўся артыкул апраўргаючы ўра-патрыятызм віцэ-маршалка Дэмбскага і рэшты нашых самаўрадавых улад адносна таго, што ўсё з падтыкоцінскім лётнішчам будзе о'кей і што ўсе фармальныя працэдуры ўдасца аформіць у пару так, каб паспець яшчэ на гэтую мэту выстарацца грошы з еўрасаюзнай пулькі. Аўтарка артыкула прыводзіць словы Бюро інвестыцый у падляшскай Маршалкоўскай управе Ірэнеўша Даманскага:

— Наш рэгіён мае іншыя атракцыёны, якія дзякуючы лётнішчу адкрыюцца на Еўропу. Скажам, Беласток, які робіцца на нашых вачах штораз больш сучасным. Будуем оперу (...). Варшава не мае ўсходняй абыходнай дарогі. Пару разоў здарылася мне загразнуць у заторы і бачыць толькі хвост адлятаючага з Акэнця самалёта. Таму хочам мець уласны аэрапорт.

Абмінем — як разумею — слоўны неўпапад пана дырэктара, што аэрапорт мае ўзнікнуць таму, што здараецца яму загразаць у варшаўскіх заторах і тое, што не разумею, як маецца ўзнікаючая опера да функцыянавання будучага лётнішча. Пан Даманскі — так як і яго прынцыпалы — адзначае, што лётнішча з'яўляецца прыярытэтнай справай, паколькі „спрычыніцца да таго, што на Падляшша з'едуцца інвестары, якія сёння наракаюць, што няма як да нас дастацца". Гэтая аргументацыя заўсёды здавалася мне быць крыху недарэчнай. Добры інвестыцыйны клімат і звычайная бізнесовая калькуляцыя, дзе інвеставаць нельга, а прынамсі не ў першую чаргу, важнейшыя ад таго, ці бізнесоўцы дабяруцца на інвестыцыйную тэрыторыю сухапутным, марскім ці паветраным транспартам. Дарэчы, ведаю выпадак аднаго бізнесоўца, ад гадоў аднаго з найбагацейшых і найбольш уплывовых польскіх прадпрымальнікаў, які на сустрэчу ў Падляшскім клубе бізнесу прыляцеў на сваім верталёце, прызямляючыся паблізу сядзібы гэтай арганізацыі (на беластоцкіх Дайлідах).

Большасць аргументаў падрываючых ідэю будовы лётнішча пад Тыкоцінам у „Палітыцы" прамаўляе да нашай уявы. Журналістка піша: „Турысты прыязджаюць над Нарву і Бобру, каб паназіраць за пералётамі птушак, а не самалётаў. Падляшша прыцягвае турыстаў з Польшы і ўсяе Еўропы. Развіваецца агратурызм, узнікаюць фірмы гідаў, рэстараны, гасцініцы". Звяртае ўвагу на тое, што дарожка планаванага лётнішча мае быць распаложана 2 кіламетры ад мяжы ахоўнага абшару Натура 2000, дык канцы стартавай паласы маюць увайсці ў пералётныя птушыныя калідоры. І тут прыводзіць словы Малгажаты Гурскай, лаўрэаткі сёлетняй узнагароды Гольдманаў (такая экалагічна Нобелеўская прэмія): „Не мае значэння самая лакалізацыя інвестыцыі, але абсяг яе ўздзеяння".

Маршалкоўская ўправа расходуе мільёны на падрыхтоўку рапартаў неабходных для разгортвання пабудовы лётнішча. Не чакае рашэння ў гэтай справе Еўрапейскай камісіі. А можа стацца так, як было ў выпадку Каменца-Сілезскага, калі яго ўлады па адмоўнай кансультацыі ЕК перанеслі дафінансаванне еўрапейскіх фондаў з аэрапорта на пабудову дарог. І можа добра сталася б, каб так было і ў нас. Думаю не толькі аб дарогах, але і аб хуткіх чыгуначных спалучэннях Беластока са светам і свету з хоць бы такім цудам натуры, якім без сумнення з'яўляецца Белавежская пушча, якой сталіца з-за чыгункі ад яго адцятая.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Пры грыбах пра гміну

Позна папоўдні, у суботу папярэджваючую адкрыццё новай будыніны ратушы ў Міхалове і на некалькі дзён прыпозненае традыцыйнае ўжо Свята грыба, некалькі мужчын у распаложаных у гэтай гміне Шымках, звычайна — як гэта ў суботу ў гэтую пару — дэбатуючы тушыла прагу пад мясцовай крамай. — Відаць, што будуць выбары. Назарка ўжо пачаў ездзіць па вёсках. Дарогу дык выбудаваў да сям'і ў Юшкавым Грудзе, а ў нас нічога не зрабіў. І яшчэ сабе палац адкрывае!

Шафёр ранішняга, дваццаціпаругадовага ПКСа ў Міхалова праз Жэдню, а далей у Гайнаўку, у нядзельнае Свята грыба задзівіў пасажыраў: „Ведаеце, выслалі мяне ў гэты шлях першы раз. Як даехаць у Гайнаўку дык ведаю, але як праз Міхалова — не вельмі. Нават карты мне не далі. Можа хтосьці пакажа, як даехаць?

Пасажыр, мужчына сталых гадоў, у элегантным касцюме, сеў паблізу шафёра: „Добра. Я да сябе, у Міхалова. Дарогу ведаю".

Нашто гэты палац?

Элегантны пасажыр не падвёў як чалавечы GPS. Праз нейкія паўгадзіны, зварочваючы ўправа з бабровіцкай дарогі, кожныя два-тры кіламетры стаялі на абочыне машыны, а ў глыбі лесу было відаць групкі з кошыкамі і кулькамі. Некаторыя былі ўжо поўныя грыбоў. У Міхалове аўтобус спыніўся насупраць аграмаднага будынка, які быццам палац — пры новай ратушы. Цяпер каля трыццаці асоб працуе тут на больш за 1 600 квадратных метрах. Гэта пра гэты „палац" гаварылі дзядзькі пад „склепам" у Шымках. Адкрылі яго крыху больш за тыдзень таму з вялікай пампезнасцю ў святле телекамер і фоталямпаў рэпарцёраў. У „Gazecie Michałowskiej" яшчэ перад гэтай галай бурмістр Марэк Назарка ганарыўся, што ўдалося паставіць новы магістрат танна, бо агулам за няцэлыя 6 мільёнаў злотых, пры гадавым бюджэце Міхалова каля 22 мільёнаў зл.; атрымалася па 3 тысячы 603 злотыя за квадратны метр: „Добрым прыёмам быў падзел інвестыцыі на два этапы. Дзякуючы гэтаму такая нізкая цана. Пры пабудове карысталіся мы матэрыяламі з г.зв. сярэдняй і ніжэйшай паліцы, а калі атрымаўся ў нас такі харошы вынік, дык гэта цешыць".

Адказаў ён так на запыт Мікалая Грэся, галоўнага рэдактара „Gazety Michałowskiej", які ў ім параўноўваў цану квадратнага метра новай ратушы з цаной аднаго квадратнага метра карыснай плошчы ў офісных будынках публічнага карыстання высокага стандарту — 8 тыс. 433 зл. і сярэдняга — 4 тыс. 456 злотых.

Калі дайшлі мы да амфітэатра, да выезду ў лес збіралася чарговая група грыбнікоў. Атрымалі яны ад арганізатараў з міхалоўскага цэнра культуры кошыкі і шапачкі. Урэшце паляўнічы сігнал адыграны на рогу лесніком з Надлясніцтва Жэдня даў знак грыбному бою. Поспехаў жадаў грыбнікам асабіста сам бурмістр. Калі аматары лясных пошукаў рушылі на спецыяльным аўтобусе ў лес, мы пачалі распытваць пра „палац".

— Я рады, што хтось глядзеўшы на нашу ратушу параўноўвае яе з палацам. Збудавана яна на працягу няпоўных двух гадоў, ды ў сапраўднасці прымяркоўваліся мы да яе ўзнікнення дваццаць гадоў, ад часу ўзнікнення самаўрада. Калі б не ўдалося за гэты час, асабліва за апошнія восем гадоў [за час валодання ў Міхалове Марка Назаркі — М. Х.] выбудаваць водаправодаў, каналізацыі, шмат кіламетраў дарог, дык яна б не ўзнікла. Ратуша, апрача таго, што з'яўляецца ўстановай, ёсць і сімвалам і сведчаннем таго, на якім узроўні знаходзіцца наша гміна і на якім узроўні жывецца нашым жыхарам. Праз год адкрываем крыты басейн. Нават не ўсе павятовыя гарады маюць крыты басейн. На тэрыторыі гміны маем аж пяць асяродкаў здароўя, што з'яўляецца рэдкасцю. Згодна з нашай праграмай, аж 50% даплачваем да лякарстваў для старэйшых асоб, што не сустракаецца ў іншым месцы. Значыць, даспелі мы да таго, каб пабудаваць візітную картачку нашага горада — ратушу, да таго ратушу на пакаленні.

Пры нагодзе Свята грыба, мы атрымалі ад бурмістра торбу з прамацыйнымі матэрыяламі гміны: буклетамі, аўтаручкай, графікамі з Міхалоўскай гміны аўтарства Уладзіслава Петрука, прызнанага мастака пражываючага ў Каралёвым Мосце (Гарадоцкая гміна). Апынуўся там між іншым кубак з выявай новай ратушы з аднаго боку. Насупраць на пасудзіне віднее крылатая думка: *Dla dumy i lepszej przyszłości pokoleń* з подпісам: *burmistrz Michałowa Marek Nazarko*".

Што б вы хацелі яшчэ?

Грыбнікі змагаючыся за званне „Уладара грыбоў" пранікалі ў блізкія лясы. На амфітэатральнай сцэне ў экалагічнаясных конкурсах змагаліся паміж сабою дзеці з пачатковых школ з Міхалова і Гарадка. Іх змаганні кончыліся нічыёй. Сярод латкоў вакол амфітэатра, побач сталоў з разнавіднымі грыбамі, кідаўся ў вочы намёт з выстаўкай драўляных скульптур Уладзіміра Наумюка. Пад невялікімі рэзьбамі — вершы Яна Леанчука. Пад адной з іх: „Трэба рыбаком нарадзіцца // каб адчуць пульс // водаў зямлі // трэба быць рыбаком// з-над берагоў Нарвы // каб у Канюках // // зразумець пераплываючае жыццё". З другога боку Барбара Пахольская, прэзас Таварыства сяброў Саколя, раздавала каталог з выставы „Крышынкі гісторыі вёскі Саколе і ваколіц".

— Рыхтуем цяпер выданне кніні „Легенды Саколя і ваколіц". Будуць тут аповеды мясцовых, скажам, пра духа Ціпорра ці каня без скуры, што паяўляўся ў Саколі. Хочам, як Таварыства разам з салэцтвам, у паўстаючым у Саколі Цэнтры захавання краявіду зрабіць штосьці для вёскі, але і для прыезджых. Усё гэта, аднак, залежыць ад таго, ці ўзнікне начлежная і харчовая база. Заявы на грошы на ўзнікненне Цэнтра падалі мы ўжо ў Еўрасаюз. На свяце паявіліся знакамітасці з Беластока. Быў ваявода Мацей Жыўна (з сынам). Можна было прыкмеціць рэктара Беластоцкага ўніверсітэта Ежы Нікітаровіча (з жонкай). А жыхары Міхалова былі перапоўненыя гонарам. Ад амаль двух гадоў яны — мястовыя, бо разам з Крынкамі Міхалова атрымала тады гарадскі статус. Што гэта змяніла? Бурмістр Назарка:

— Сёння пытанняў, ці варта было, ніхто не ставіць. Лягчэй было дзякуючы таму, што мы горад, знайсці грошы на пабудову крытага басейна. Маем карэтку скорай дапамогі і якраз ратушу. Будуецца дарога Заблудаў — Гарадок і праз Жэдню добрае спалучэнне з Беластокам.

— Ды ў Шымках наракаюць на дарогі.

— Я спытаўся, ці там пад крамай у Шымках гавораць такое ў цвярозым відзе. Гэта нязгоднае з праўдай. Мы размяркоўваем бюджэт так, што грошы дзеляцца пароўну на ўсю тэрыторыю і на само Міхалова. Кожная дарога, што выходзіць з Шымак — асфальтаваная, і ў Цісоўку, і ў Навасады аж да Залешан, у Лявонавічы, Бахуры, і ў Луплянку таксама. Маюць Шымкі асяродак здароўя. Ёсць там малы цэнтр культуры, у якім маюцца пажарніцкае дэпо і святліца з малым бібліятэчным пунктам. Штогод езджу на сустрэчы ў глыбінку. Буду ў Шымках пад канец верасня і спытаюся: „Што б вы хацелі яшчэ?" Калі людзі скажуць, чаго дэталёва хочуць, знойдуцца вырашэнні, гэта тэхнічная справа. Няхай скажуць, пра якую дарогу была гаворка. Напэўна, аднак, у Шымках не ўзнікне цэнтр культуры, бо такі ёсць у Міхалове, так як у Міхалове не будзе оперы, бо будзе такая ў Беластоку.

Дарога для сям'і?

У Міхалове пад крамай людзі гавораць па-свойму. Шкадуюць: „Назарка кажа, што ён тутэйшы беларус, а гаворыць па-польску".

Бурмістр:

— У мяне беларускія карані. Мама паходзіць з Крыніцы, а тата з Юшкавага Груда. Маем у гміне шмат беларускіх мерапрыемстваў. Настойваю, каб у ГОКу гэту культуру распаўсюджвалі. Па Фабрычнай вуліцы ўзнікне Галерэя старога фільму і фатаграфіі, якая будзе гаварыць пра людзей тут пражываючых, між іншым, вядома, і аб беларусах.

— Дарога ў Юшкаў Груд, значыць — дарога для сям'і з бацькавага боку?

— Дык у Юшкавым Грудзе цяпер ніхто з маёй сям'і не жыве.

— А што з двухмоўнымі назвамі? У Шымках — не супраць.

— Я надалей супраць, адносна ўвядзення двухмоўных назваў у Польшчы ўвогуле. Гэта непатрэбнае. Не трэба гэтых спраў лішне ўскладняць.

— Можа, у сувязі з уступленнем у сілу дамовы аб малым памежным руху з Беларуссю, узнікнуць у Міхалоўскай гміне нейкія большыя інвестыцыі, як ІКЕА ў Орлі?

— ІКЕА там узнікае таму, што Орля распаложана на мяжы трох паветаў, бо нават адзін павятовы горад не забяспечыць ім столькі работнікаў, колькі трэба. Прадпрыемства на дзвесце-трыста асоб у Міхалоўскай ці Гарадоцкай гміне магло б узнікнуць, бо знайшлося б столькі людзей. Ды не тысячы, як будзе гэта ў фабрыцы ІКЕІ. Вядзем, аднак, размовы, каб адзін з кааперантаў гэтай фабрыкі меў сядзібу на тэрыторыі нашай гміны.

Калі бурмістр распавядае аб інвестыцыйных планах, грыбнікі з кашамі поўнымі грыбоў вяртаюцца пад амфітэатр. Ірэна Яроцкая з Ваяводскай санэпідэмстанцыі адкідвае воўчыя грыбы. У аднаго грыбніка збор у кошыку меншае аж напалову! Застаюцца сапраўдныя — баравікі, многа лісічак...

Ірэна Яроцкая:

— Грыбы не маюць нейкіх харчавых каштоўнасцей, адно смакавыя. Найбольш каштоўныя — пячурыцы. У лясных грыбах могуць быць, на жаль, прысутныя шкодныя цяжкія металы.

„Уладаром грыбоў" стала солтысіха Міхалова І Ніна Бяленя. Сабрала ў паўгадзіны... амаль шэсць і паўкіло. Прыглядаючыся ўзважванню і селекцыі лясных прысмакаў войт дзівіцца: „Як гэта магчыма, каб за такі час столькі сабраць? Мабыць, хтосьці там у лесе ёй раней іх назбіраў".

Гэта, аднак, застанецца ўжо таямніцай міхалоўскіх узлескаў.

Хто паклапоціцца?

На дарозе Кузава — Чаромха-Вёска знаходзяцца два чыгуначныя пераезды без нагляду. Адзін на лініі Чаромха — Гайнаўка, а другі на беластоцкай лініі. На гайнаўскім пераездзе яшчэ нядаўна працаваў пуцявы майстар, які закрываў шлагбаўм, але ў выніку апошняй чыгуначнай рэструктурызацыі былі абмежаваны штаты рабочых і чалавека заступіла тэхніка. Абодва пераезды сумяжуюць з сабою, адно раздзяляе іх не больш чым стометровы прамежак. Праехаць згаданыя пераезды публічнай дарогі, гэта сапраўдны кашмар для карыстальнікаў. Мала таго, што чыгуначны пуць без светлаводаў, ды да таго ж дарога дзіравая, быццам сіта. Ямка на ямцы едзе ды ямкай паганяе — як гаворыць народная мудрасць. Ды і гравійка ў вёску Чаромху не найлепшай якасці. На апошнім вясковым сходзе кузаўцы прасілі войта, каб паправіць дарогу ад святліцы да пуці і далей у вёску Чаромху. Па апошніх ліўнях дарога яшчэ больш папсавалася і цяпер можна тут ліхаманкі набавіцца едучы на машыне ці нават роварам. Хто паклапоціцца за чыгуначныя пераезды на згаданай дарозе і засыпле ямкі? Гэта ж сапраўдная пагроза дарожнай аварыі. Ці адказныя чыноўнікі дзяржаўнай адміністрацыі стануць шукаць віноўнікаў, калі здарыцца выпадак? Не тады сабак кормяць, калі на паляванне ідуць. Гэта даю пад развагу гміннаму самаўраду, як і Беластоцкаму чыгуначнаму прадпрыемству.

PS. Калі нехта адважыцца заняцца дарогаю Кузава — Чаромха-Вёска, дык напамінаю, што гравійка побач спартыўнага стадыёна „Калеяж" патрабуе падсыпкі. Гэта невялічкі кавалачак дарогі, якою карыстаюцца не толькі футбалісты, але на штодзень чыгуначныя работнікі паравознага дэпо і шматлікія сяляне.

Адноўленая магіла

За Кузаваю пры дарозе ў лесніччоўку знаходзіцца магіла, дзе ў 1944 годзе былі захаваны танкісты з разбітых савецкіх танкаў. Пасля вайны астанкі загінуўшых былі перавезены на магільнік савецкіх воінаў у Мілейчычы. Пры камуне нейкі час магілай апекаваліся школьнікі, але з ходам часу традыцыя загінула і месца памяці трагічных змаганняў за кузаўскую зямлю было забыта. Пісаў я аб гэтым у „Ніве". Паслаў афіцыйную заяву гміннаму самаўраду і прад'явіў прапанову аднавіць магілу. Гаварыў таксама з сакратаром Гміннай управы. Мне сказалі, што гэта залежыць ад Ваяводскай управы, якая прызначае грошы на аднаўленне так вайсковых магільнікаў, як і паасобных магілак. Ад маёй размовы мінула шмат часу. Нядаўна праязджаючы ў лес па грыбы прыкмеціў я адноўленую магілу савецкіх танкістаў. Шыкоўна зроблена, хоць і без мармуравай табліцы ды такога ж крыжа. Звычайная абрамоўка з бярозавым крыжам, ды пасаджанымі жывымі кветкамі і аздобленая штучнымі, зроблена па-майстэрску. І факт гэты годны пашаны.

Уладзімір СІДАРУК

Сто гадоў з роднай музыкай

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Хачу падзяліцца ўспамінамі, уражаннямі, сяброўствам з шаноўным спадаром Пятром Юшкевічам з вёскі Збуч, з дому 44, Чыжоўскай гміны. Распавесці гісторыю аднаго нядрэнна і небязмэтна пражытага жыцця — пра лёс чалавека, пра якога вартасць, жыццёвую праўдзівасць і каларытнасць таленту можна сказаць: „Вось што любоў да песні і музыкі робіць з людзьмі".

Абранніцай яго душы была песня. Ён культываваў яе ўсё жыццё.

Нарадзіўся Пятро Юшкевіч 2 кастрычніка 1910 года ў вёсцы Збуч Чыжоўскай гміны. Яго маці Марта, у паненстве Грыгарук, бацька — Ілья. А сам ён меў жонку Марыю і чацвёра дзяцей: Клаўдзію (памерла), Ірыну, Валянціну і сына Косцю (настаўнік, вядомы беларускі дзеяч, працаваў у школе ў Іванках — дырэктарам, пасля ў Нарве).

Мой герой расказвае:

„У 1914 годзе трэцяя частка жыхароў вёскі Збуч паехала ў бежанства ў глыб Расіі. Тады мне было каля чатырох гадоў. Прыпамінаю, што на нашым возе была ўстроеная нейкая буда, накрытая палатном. На возе ляжала таксама паша для двух коней. Ехалі ім дзве сям'і — Юшкевічы і Грыгарукі. Мая мама расказвала, што на нейкай станцыі пагрузілі нас у таварныя вагоны і адправілі ў Расію. Аказаліся мы ў Тамбоўскай губерні, у Барысаглебскім уездзе, у сяле Каралоткіна. Людзі прынялі нас, былі вельмі добрымі, дапамагалі нам усялякімі прадуктамі, давалі тое, чаго нам не хапала. Калі наступіла змена ўлады, прыйшлі камуністы, пачаліся забойствы памешчыкаў і багацеяў. Да нас, бежанцаў, не было варожасці з боку новай улады. Бацькі рашылі вяртацца дахаты. Быў 1918 год, якраз Каляды...

Мой бацька быў таксама адданы царкоўнаму пенню. Усё сваё жыццё рэгентстваваў, таксама калі мы былі ў Расіі. Там сарганізаваў царкоўны хор. Памятаю, кожную суботу была спеўка. У хары было каля 20 харыстаў, жанчын і мужчын. У хары спявалі таксама мае сястра і брат. У царкву забіралі і мяне, і я спяваў „Отча наш" дыскантам...

Прыбыўшы на сваю малую радзіму бацька зноў заняўся царкоўным спевам, аж да самае смерці (памёр 15 лютага 1937 г.). Калі я пайшоў у школу ў Старое Беразова, захварэў тыфам. Мабыць, прычынай хваробы быў голад. Не было хлеба ні бульбы. Прапусціў я шмат урокаў з-за хваробы. Вучыўся я нядрэнна, першым адказваў на пытанні настаўніка. Бацькі былі рады маім поспехам у вучобе. Быўшы ў чацвёртым класе, атрымаў я білет на дзесяцідзённую экскурсію ў Познань і Варшаву; з вучняў вясковых школ Арлянскай гміны быў толькі я. Апошнія вучні на экскурсіі былі гарадскія, некаторыя былі з бацькамі. Сярод вучняў я вылучаўся беднай вопраткай, але адчуваў сябе ўпэўнена і бадзёра. Меў я ад бацькі толькі 5 злотых, і я вельмі пільнаваўся каб трапна расходаваць гэтыя грошы, каб хапіла на ежу (харчаванне кожны аплачваў сам). І не хапіла. Настаўнік з Гайнаўкі даў мне дваццаць злотых. Бацька пасля экскурсіі паехаў да яго разлічыцца, ды настаўнік не хацеў іх узяць... Чатырокласную школу я кончыў у 1923 годзе. Ад таго часу пад кіраўніцтвма бацькі я дапамагаў у гаспадарцы...

Бацька меў скрыпку, з якой развучваў песні з хорам па нотах. Цікавіла мяне музыка рознага віду, музычныя інструменты, асабліва скрыпка і сяміструнная гітара. Я вельмі хацеў вучыцца іграць, бацькі прыкмецілі, што ў мяне ёсць здольнасці да музыкі і спеву. Свабодным часам я стаў вучыцца іграць на скрыпцы і гітары. Вучыць мяне ў музычнай школе бацькі не мелі магчымасці. І таму мой талент і мая ахвота перамаглі ўсялякія цяжкасці, каб быць з мастацтвам...

У 1939 г. мабілізавалі мяне ў армію. Служыў я ў 344 палку пехацінцаў Польскага войска ў Белай-Падляскай. Калі 1 верасня 1939 г. наш полк стаяў у абароне Тухолі, дзе нас 7 верасня разбілі нямецкія войскі. Было гэта недзе ў ваколіцы Тэрэспала-Паморскага. Я трапіў у нямекі палон у Грэсвальд. У час транспарту ў глыб Нямеччыны я 12 верасня ўцёк, дабраўся дадому. У час вайны супрацоўнічаў з савецкай партызанкай (з Пятром Грыгаруком і Аляксандрам Грыгаруком ды іншымі падпольшчыкамі). Пасля вайны ад 1950 года шмат гадоў быў солтысам, а пасля працаваў у радзе гміны Чыжы, у малочных кааператывах, у вытворчым кааператыве, быў складаўшчыком у Збучы..."

Стаж работы Пятра Юшкевіча вялікі, усюды цешыўся аўтарытэтам, быў узорам сумленнага працаўніка. У яго многа грамат, медалёў, пахвал за сумленную працу, між іншым — медаль „Заслужаны Беласточчыне", Заслужаны дзеяч культуры.

Калі Пятро застаўся працаваць на гаспадарцы ў Збучы, налічвала яна каля 18 гектараў.

„Мелі мы двое коней, чатыры каровы. І ўсё астатняе, як у гаспадарцы — свінні, авечкі і ўсяго патроху. А для душы — царква. Ад маладых гадоў я быў звязаны з чыжоўскай царквой. Там 10 гадоў быў псаломшчыкам, вёў царкоўны хор, спяваў басам, іграў на скрыпцы. Паза заняткамі ў царкве, актыўна дзейнічаў у хоры пры Павятовым аддзеле БГКТ у Гайнаўцы. Гэты хор усюды ўславіўся папулярнасцю. Шмат гадоў спяваў у хоры „Рэха пушчы", што пры ГДК у Гайнаўцы.

Я пазнаёміўся з Пятром Юшкевічам у 1960 годзе, калі я дзейнічаў у Беларускім таварыстве, а пасля быў там штатным працаўніком (інструктарам і сакратаром). Давялося мне сотні раз арганізоўваць і бываць на канцэртах хору пры аддзеле БГКТ у Гайнаўцы, дзе выступаў і наш Юбіляр, руплівец прапагандавання беларускай народнай песні.

У кожнага свой шлях да веры, да царквы. Свой шлях і ў Пятра Юшкевіча, які перакананы, што адносіны чалавека да духоўнасці, веры, сваёй спадчыны, культуры, народных песень прадвызначаюць не толькі ўласны лёс, але і лёс нашай беларускай традыцыі. Ён быў і ёсць гэтага свядомым за сваё стагоддзе: „Рэлігійныя традыцыі панавалі ў нашай сям'і здаўна. Рабілі мы ўсё гэта прынцыпова і свядома, бо адчувалі тое, бацькі і я, што мы беларусы, што мы грамадзяне малой нашай айчыны на Беласточчыне..."

У нашага мастака захаваліся і працуюць дзве гітары — адна шасціструнная, другая сяміструнная, мандаліна, балалайка, акардэон „Куявяк". Кажа, гітара стварае натхненне для спеву, а скрыпка — каралева ўсіх інструментаў. Калі я быў у яго дома, узяў ён балалайку і зайграў ды праспяваў мне „Мой родны кут, як ты мне мілы".

Узнагароджаны Пятро Юшкевіч, ганаровай граматай ад упаўнаважанага па справах рэлігіі і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь Леаніда Гулякі „за шматгадовую актыўную дейнасць у справе захавання і развіцця культурнай спадчыны беларускага народа" ў сувязі са стагоддзем ад дня нараджэння. Віншавалі Юбіляра і прэм'ер РП Дональд Туск, Падляшскі ваявода Мацей Жыўна, войт Чыжоўскай гміны і іншыя чыноўнікі. Былі граматы, падарункі, букеты кветак — святліца ў вёсцы Збуч запоўнілася гасцямі і роднымі Юбіляра пры багатым застоллі. Працягваліся ўспаміны, гучала музыка...

Паляванне на цудоўнага аленя

Алег ЛАТЫШОНАК

Калі я пабачыў у Кельцах, сталіцы Святакрыжскага ваяводства, першы Двайны грыж, адразу нарадзілася ўва мне прадчуванне адкрыцця. Гэтае прадчуванне ўзмацнілася, калі мы пачалі падымацца на гару Святы Крыж, вядомую таксама пад ранейшай назвай Лысец, або Лысая гара. Калі нейкая гара Лысая — непазбежна спаткаеш тут ведзьмаў, апошні прывід старажытных культаў. Як след даўняга культу застаўся каменны вал, вышынёй сёння ў метры два, шырынёй у метраў шэсць ля падставы, які аточвае амаль усю гару. Мясцовы люд аддаваўся падазроным ігрышчам амаль да нашых дзён, а калі нарэшце гэтыя ігрышчы выкаранілі і замянілі іх каталіцкімі набажэнствамі, стаў далучацца да нейкіх сектаў. Падымаліся мы праз цёмны, затканы імглою, пранырлівы яловы (піхтавы) лес — славутую Ядловую пушчу. Верх гары таксама ўвесь быў у тумане. На гэтай гары царква ўжо тысячу гадоў змагаецца з цёмнымі сіламі.

Паводле легенды, калі венгерскі каралевіч Амерык* збіраўся з візітам да Баляслава Харобрага, яго бацька Сцяпан (Іштван) I завесіў яму на шыі энкальпіён — нагрудны крыж у форме двайнога крыжа, у якім захоўваліся пяць трэсак са Святога Крыжа, адшуканага імператрыцай Аленай. Двайны крыж, вядомы таксама як іерусалімскі, ламбардскі, патрыяршы, уздзвіжанскі, а ў нас яшчэ і еўфрасіннеўскі, сімвалізуе між іншымі перамогу хрысціянства над язычніцтвам. Таму вельмі дарэчы быў як нашым продкам, так і венграм — Амерык быў хрысціянінам толькі ў трэцім пакаленні.

Баляслаў прыняў Амерыка ад шчырага сэрца. Хаця Амерык паломнічаў да мошчаў святога Вайцеха, адводзіў душу на тыпова ваярскую забаву — паляванне. Аднойчы паляваў і на схілах Лысай гары. Пагнаўся за незвычайна вялікім і прыгожым аленем і забрыў далёка ў лес. На канец алень захрасну паміж зараснікаў і каралевіч ужо меў выпусціць у яго стралу, калі алень павярнуў галаву ў яго бок, а паміж ягоных аграмадных рагоў заззяў незямным бляскам двайны крыж. Аслеплены на момант каралевіч стрымаў руку, і цудоўны алень знікнуў сярод дрэў. Амерык зразумеў, што гэта знак, што такім чынам аб'явіўся яму Збавіцель, і заснаваў на гары манастыр, якому ахвяраваў свой нагрудны крыж. З гэтай пары гэты двайны крыж — галоўная святыня манастыра на Лысай гары, якая і стала называцца проста Святым Крыжом.

Каралевіч Амерык загінуў молада на паляванні ў 1031 г., забіты дзіком. Паводле жыція, заставаўся бязжэнным, а напэўна памёр беспатомным. Хутка абвясцілі яго святым. Прадстаўляюць яго з лілеяй, мячом і Двайным крыжом — гербам Каралеўства Венгрыі. На радзіме лічыцца патронам моладзі; чэсць аддаюць яму 5 лістапада.

З гэтай пары шмат хто з польскіх каралёў наведваў манастыр на Лысай гары, каб пакланіцца святому крыжу. Напэўна былі тут Уладзіслаў Лакотак і яго сын Казімір Вялікі. Усё ж такі самую гарачую любоў да Святога Крыжа адчуваў Ягайла і яго нашчадкі. Кажуць людзі, Ягайла трапіў туды першы раз у 1370 годзе сярод літоўцаў, якія наехалі Польшчу і між іншым напалі і разрабавалі тутэйшы манастыр. Калі ў 1386 г. Ягайла яшчэ язычнікам ехаў у Кракаў на хрышчэнне і шлюб з Ядвігай, наведаў Святакрыжскі манастыр. Калі працягнуў руку да цудоўнага крыжа, страціў уладу ў руцэ. Чуццё вярнулася ў руку толькі тады, калі пакланіўся святыні. Стаўшы каралём, Ягайла-Уладзіслаў кожны год паломнічаў у Святы Крыж. У 1410 г., перад дубровенскай (інакш грунвальдскай) бітвай два дні прабываў у Слупі, вёсцы пры падставе гары і кожнай раніцай падымаўся пешшу ўверх, дзе праводзіў час на малітве і раздачы міласціны.

З нашчадкаў Ягайлы найчасцей — дзесяць разоў — пабываў на Святым Крыжы кароль Казімір Ягайлавіч. Жыгімонт Стары падымаўся туды шэсць разоў. Як цяжкі быў гэты шлях, сведчыць тое, што аднойчы памёр там шляхціч, які памагаў гэтаму вялікаму і цяжкаму каралю падымацца ўверх. Жыгімонт аднойчы наведаў манастыр з жонкай, каралевай Бонай і дзяцьмі. Яго сын Жыгімонт Аўгуст быў там тройчы.

На гэтай гары я ўжо быў раней, і калі зышоў з яе, так мяне забалела ў крыжах, што не мог рушыцца з болю. Але прабеглі мы тады гэтую гару як турысты, што скачуць па горах, Святому Крыжу не пакланіліся, паганцы, дык і адняло мне ногі як таму Ягайле руку. І гэтым разам падымаўся я не як пілігрым, але прынамсі з адкрытымі вачыма. Таму і атрымаў сваё — рука, якая баліць мяне ад пачатку года, так і баліць надалей, але прынамсі прасвятліла мяне навукова...

Здаўна цікавяць мяне нацыянальныя сімвалы, і таму ў Кельцах маю ўвагу звярнуў Двайны крыж, які мае на сваім шчыце наша Пагоня. Ужо некалькі гадоў таму пераканаў мяне кракаўскі даследчык Зянон Пех, што Ягайла жэнячыся з Ядвігай прыняў належны ёй герб Каралеўства Венгрыі Двайны крыж як асабісты герб і дадаў шчыт з гэтым крыжом Пагоні. Візіт на Святым Крыжы і расказ пра пакарэнне Ягайлы Двайным крыжом яшчэ мяне ў гэтым перакананні замацавалі.

Але гэта яшчэ не прасвятленне. Яно адбылося ў момант, калі прыйшло мне ў голаў, што цудоўнага аленя, які паказаўся святому Амерыку, а пасля знік, адшукаць можна ў гербе Гародні!

Герб надаваўся разам з самакіраваннем на моцы магдэбургскага права, але Гародня атрымала магдэбургскае права ў выніку доўгага працэсу; няясныя таксама пачаткі самога герба. Частковае магдэбурскага права надаў Гародні Ягайла-Уладзіслаў у 1391 г. Пра тое, хто надаў поўнае, пішуць па-рознаму. Паводле адных такое права горад атрымаў ад Казіміра Ягайлавіча ў 1441 г. (1444) г. Паводле іншых, поўнае права надаў Гародні Аляксандр у 1496 г. У 1540 г. каралева Бона дала Гародні прывілею, згодна якой гарадзенскаму войту і магістрату дазвалялася мець сваю гарадскую пячатку. У 1541 г. новай прывілеяй яна нагадала айцам горада, што неабходна завесці новую пячатку і ўпарадкаваць яе захоўванне: пячатка павінна была захоўвацца у спецыяльнай скрыні ў ратушы, а тры ключы — адпаведна належалі войту, бурмістру і літоўскаму радцу. У 1564 г. магдэбургскае права для Гародні зацвердзіў сойм. Такім чынам горад мог мець герб і пячатку з выявай герба.

Найстарэйшая пячатка г. Гародні з выявай аленя вядомая з 1565 г. Не ведаю, хто першы прыдумаў, што алень у гербе горада належыць святому Губерту. Напэўна не мае гэта ніякага пацверджання ў дакументах, бо св. Губерт тут ні пры чым. Яго культ на землях Рэчы Паспалітай стаў пашырацца толькі на пачатку XVIII ст., пры саксонскай дынастыі. Ягелоны да св. Губерта ніякай цікаўнасці не праяўлялі. Затое кожны з іх, хто нейкім чынам адзначыў сябе ў гісторыі Гародні, Ягайла, Казімір Ягайлавіч, Жыгімот Стары з каралевай Бонай ды іхні сын Жыгімонт Аўгуст, паломнічалі на гару Святы Крыж і напэўна ведалі легенду пра яго заснаванне. У выпадку каралевы Боны можна яшчэ ўлічыць злашчасны ўпадак з каня на паляванні ў 1527 г., калі яна заўчасна нарадзіла свайго другога сына, Альбрахта, які памёр у дзень нараджэння. Пасля гэтага Бона не магла мець больш дзяцей. Відавочна таксама культ дынастычнага святога Ягелонаў, каралевіча Казіміра, які памёр у Гародні ў 1483 г., фармаваўся на ўзор культу венгерскага каралевіча св. Амерыка — младзенца з лілеяй у руцэ. Св. Амерык відаць таксама натхняў любоўю да апекаванага сабою горада свайго суайчынніка, караля Сцяпана Батуру.

Такім чынам, сапраўдны патрон Гародні відаць — святы Амерык Венгерскі, а гарадзенскі алень св. Амерыка павінен атрымаць належны яму Двайны крыж між рагамі.

* Імя Амерык паходзіць ад нямецкага імя Генрых. На латыні пісалася Henricus, а пазней Emericus. Адсюль імя Эмэрык. З жыхароў Беларусі найбольш вядомы яго носьбіт відаць Эмэрык Чапскі. Мадзьяры вымаўлялі гэтае імя як Эмрэ, пазней Імрэ. У выніку далейшых пераўтварэнняў Emericus перайшло ў Americus, на італьянскай мове — Amerigo. Найбольш вядомы ў свеце носьбіт гэтага імя — падарожнік і географ Амерык Веспучы, ад чыйго імя названы два кантыненты, Паўночная і Паўднёвая Амерыкі. На мой погляд, па-беларуску імя святога найлепш гучыць якраз у форме Амерык.

Дрэнная дарога

Калі ехаць ваяводскай дарогай № 687 з Навасадаў у Нараўку, Бандары і Юшкаў Груд, аўтобус ПКС увесь час дрыжыць-калоціцца ды падскоквае, быццам танцаваў. Усё з-за няроўнага ўхабістага асфальтавага палатна. Далей з Юшкавага Груда ў Міхалова, Жэдню і Вілы маставая такая ж. Да таго гэтая шаша вузкая і таму небяспечная.

Ехаў я надяўна ваяводскімі дарогамі з Беластока ў заходнім напрамку і там маставая гладкая ды роўная. А вось вышэйзгаданая дарога, у тым і адрэзак з нумарам 687 ва ўсходнім напрамку — занядбаная. Умовы падарожжа ў мой родны кут надалей такія самыя як былі. Тут ясна, што Падляшскае праўленне ваяводскіх дарог у Беластоку вельмі скупіцца грошай на аднаўленне дарогі 687. Паставіла асцерагальныя дарожныя знакі, да таго з выклічнікам, і яны стаяць ужо пяты год!

Прызабытая дарога

Ёсць такая дарога ў Плянце. Бяжыць яна побач чыгуначнага пуці з Гайнаўкі ў Семяноўку і паўстанка, дзе была пачакальня і прадавалі білеты. У сваім пачатку ад чыгуначнага пераезда мае яна кіламетр асфальтаванай маставой, а далей вядзе гравійка. Дарогі не абкошваюць і і яна паабапал зарослая кустамі і пустазеллем. Там, дзе канчаецца асфальт і пачынаецца гравійка — пясчасны адрэзак дарогі, стаяць тры разваліны: з левага боку зваліўся дах хаты і хлява, а з правага — дах вялікай стадолы. Будынкі разваліліся ці то пад цяжарам снегу зімой, ці проста ад старасці. Сумная дарога і такі ж краявід.

Турыстычныя шляхі

Нараўчанская гміна знаходзіцца ў даліне Нарвы і Нараўкі. Тут лясы і пралескі Белавежскай пушчы. Пабудавалі Семяноўскае вадасховішча. Цікавы гэты куточак Беласточчыны. Два гады таму адкрылі тут прыродазнаўчую сцяжынку „Брама ў пушчу". Вядзе яна ад Асяродка экалагічнай адукацыі ў Семяноўцы да вышкі над урочышчам Марушка. З яе відаць шырокую панараму возера, палёў і лясоў.

Ёсць яшчэ новая веласіпедная сцежка „Зялёнага шляху". На Гайнаўшчыне шлях вядзе з Чаромхі ў Сушчу, што над ракой Нарвай — праз Кляшчэлі, Войнаўку, Якубова, Арэшкава, Янова, Грушкі, Гушчэвіну, Міклашэва, Лешукі і Новую Луку.

Вандалы ў горадзе

Ізноў збілі рог аднаму з трох зуброў-макетаў, якія паставілі ў 2007 годзе ў Гайнаўцы ля скрыжавання вуліц Баторыя, Спартыўнай і а. Дзевятоўскага (тут кругавы рух). Зуброў моцна падсветлілі ноччу і на слупе прымацавалі камеру для маніторынгу. Але гэта, відаць, нічога не дало. Адзін зубр стаў калекам! У нядзелю 5 верасня г.г. зубры мелі ўсе рогі. 6 верасня г.г. я ішоў а 14 гадзіне па вуліцы Баторыя і ўбачыў аднаго з іх без рога.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

(бурацкая народная казка)

Адкуль у месяца латкі?

Даўным-даўно ў пушчы жыла сям'я, якая кармілася працай сваіх рук. Аднаго разу маці паслала дачушку да крыніцы, якая знаходзілася далёка ў лесе. На месцы малая ўбачыла птушак якія пілі ваду і спявалі. Захопленая іх спевам прысела пад дрэвам і слухала іх мову. Тым часам маці, якая доўга выглядала дачку, гнеўна прагаварылася:

— Няма карысці з гэтай летуценніцы! Дзе ж яна прапала? Вочы выглядзіш і не дачакаешся! Хай бы яе сонца ўхапіла!

Ледзь жанчына вымавіла свае неразумныя словы, сонца і месяц навыперадкі спусціліся з неба па дзяўчынку. Малая спачатку баранілася, яна моцна абняла куст і заперлася нагамі ў зямлю. Дарэмна! Сонца вырвала яе разам з кустом і ўцягнула на неба. Па дарозе яно радасна загаманіла: *Ну, цяпер у мяне будзе мілая сяброўка!*

Месяц, які жадаў дзіця для сябе, стаў прасіць у сонца: *Я самотны як палец, сам адзін вандрую па начным небе сярод пастак і небяспек. Табе добра вандраваць у белы дзень. Ды навошта тады табе кампанія? Пашкадуй лепш мяне і адай мне дзяўчынку!*

http://www.bajdarka.republika.pl/

Сонца падумала і аддало прыгожае дзіця месяцу. З той пары яны абое пачалі хадзіць па небе, а на месяцы з'явіліся латкі.

PS. Буряты вераць, што іх народ пачаўся з дзяўчынкі і хлопчыка, што нарадзіліся ў небе і тры першыя гады жылі ў выглядзе рыб у возеры Байкал. Адна бабуля, таксама народжаная ў небе, паклікала іх на бераг і вывела на зямлю. Калі хлопчык і дзяўчынка падраслі, яны пажаніліся. З іх нарадзілася восем сыноў, якія далі пачатак васьмі бурацкім кланам. Пачаткова буряты займалі тэрыторыю ля сібірскай ракі Лена, пасля перамясціліся на поўдзень, у наваколле Баргузіна.

Зорка

Сяргей Новік-Пяюн

Восень залатая

Восень, восень залатая
Сее радасць на зямлі,
Хмарка ў сінім небе тае,
Мкнуць у вырай жураўлі.

Ніткай срэбнай павуцінне
Ў косах сонейка блішчыць.
Што за цуднае зіхценне!
Што за ціш вакол стаіць!

Я іду лясною сцежкай,
Як па мяккім дыване.
Восень з ветлівай усмешкай
На спатканне выйшла мне.

Ярка, хораша прыбрала
Ўсюды дрэвы і кусты
І зямлю памалявала
Ў колер жоўта-залаты.

Джамба і яго вайна

(бурацкая народная быль)

Даўным-даўно, яшчэ да панавання белага цара*, у адным улусе* жыў ваяр Джамба. Мацук і волат, здаравенны асілак і ветрагон. Джамба падгаварыў малойцаў каб ехалі разам з ім заваяваць багацце і славу. Доўга рыхтаваліся да паходу, вастрылі мячы, тыцалі ў калчаны стрэлы, спляталі коням грывы. Перад ад'ездам выйшаў бацька Джамбы і стаў маліць сына:

— Астанься, сынок, у хаце і будзь мне суцехай ў гады старасці. Астанься, пашкадуй старога бацьку...

Ніхто і нішто не маглі спыніць ваяра Джамбу. Ні плач маці, ні словы бацькі. Джамба сеў на каня і разам са сваёй ардой рушыў у дарогу. Ехалі-ехалі, аж апынуліся ў глыбі Сібіры. Бязлітасныя вершнікі пакідалі за сабой папялішчы і мора крыві. Ніхто не даў рады іх разбіць, аднак банда Джамбы ўсё меншала і меншала. У адзін дзень загінуў яго брат, пасля пяць дружыннікаў. Урэшце з усяе арды засталіся дзесяць чалавек. Ды ў дарозе яны наткнуліся на варожае ўзброенае племя і ў час сутычкі загінулі. Джамба ацалеў дзякуючы вернаму каню, які вынес яго з пабоішча. Пасля споўненай задачы конь упаў нежывы. Джамба пахаваў яго ў зямлі і доўга плакаў.

Малюнак Соні Сульжык з Гарадка.

Як вядома: адзін у полі не воін. Джамба рашыў вярнуцца ў родны улус. У дарозе ён харчаваўся травой і ягадамі. Пераплыў шырокія рэкі, перайшоў стромкія горы. У адным лесе ледзь не разарваў яго мядзведзь, ды ў выніку тузаніны ваяр страціў адно вока...

Шмат часу прайшло, пакуль Джамба адшукаў родны улус. Бацькі не было ўжо ў жывых, браты пажаніліся і забыліся пра яго. Калі асівелы, сляпы і кульгавы на адну нагу Джамба вярнуўся дахаты, браты не ведалі што думаць і як гаварыць. Яны не пазналі Джамбы, не хацелі прыняць яго за роднага брата:

— Калі ты наш брат, — прапанавалі, — дык дакажы сваю сілу. Наш Джамба не меў сабе роўных...

Раніцай назаўтра сышоўся ўвесь улус. Джамбу, каб даказаў сваю сілу, прывялі аграмаднага быка. Ваяр, хоць і сляпы на адно вока, узяў лук, напяў цеціву і пацэліў у жывёлу. Страла смяротна параніла звяра. Здавалася, усё будзе добра. Аднак выстрэл адняў ваяру ўсю сілу. Джамба яшчэ зірнуў з надзеяй па людзях... Ды ўпаў мёртвы пад ногі сваіх братоў.

**Белы цар — маскоўскі цар*

**улус — рухомая асада буратаў, якія выбіралі жыццё качэўнікаў.*

Зорка

PS. Буряты ў часы свабоды (да 17 стагоддзя) прапаведавалі дзесяць белых законаў: 1. Ахоўваць жыццё ўсіх жывых стварэнняў, 2. дапамагаць бедным, 3. жыць у чысціні, 4. любіць праўду, 5. любіць спакой, 6. паводзіць сябе лагодна і сумленна, 7. весці павучальныя гутаркі, 8. змагацца са страсцямі, 9. любіць людзей і быць міласэрнымі, 10. моцна трымацца веры.

Пазнай Беларусь 2010

Такі загаловак кніжкі і такі назоў конкурсу, які штогод арганізуе Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Польшчы. У кніжцы ўзнагароджаныя малюнкі, фатаграфіі, вершы і сачыненні. Падборка самых цікавых твораў размешчана ажно на 73 старонках (81 мастацкая прапанова). Паколькі да конкурсу прыступіла за чатырыста школьнікаў, кожны пяты з іх быў узнагароджаны публікацыяй у каляровым выданні. Ідэя, каб друкаваць узнагароджаныя творы ў кніжцы — класная. Дзякуючы ёй кожны чытач і глядач можа сам ацаніць прэзентаваныя працы...

Праўда, калі я прачытала кніжку „Пазнай Беларусь — 2010", у мяне склалася адваротнае ўражанне чым хоча загаловак. Памешчаная там падборка паказвае найперш нас: грамадзян Польшчы. Нашы аўтары глядзяць на Рэспубліку Беларусь вачыма турыстаў-палякаў. Амаль усе вершы і сачыненні напісаныя пафаснай мовай. Ад захапленняў і клятваў пра любоў да Разімы аж кружыцца ў галаве. На жаль, эмацыянальныя моманты не ідуць у пары з вобразнасцю слова, не складаюць аповеду, не кранаюць і не памятаюцца. Чаму так атрымоўваецца? Дзеці размаўляюць і думаюць па-польску. Па-беларуску памятаюць фрагменты вершаў, словы песень, лозунгі з нагоды беларускіх святаў. Менавіта з такіх фрагментаў пасля сплятаюць свае вершы і сачыненні. Часам капіруюць поўны твор, прытым не сустрэнеш там тлумачэння тыпу: *напісана паводле Віктара Шведа.*

Ці не лепш пайсці дарогай якой выправіўся гімназіст Якуб Сухадола з Нараўкі? У вершы „Купалле сёння" гімназіст перадаў настрой свята і выказаў сваё ўяўленне пра абрад. Ды яшчэ як сапраўдны паэт-чараўнік наклікаў „хмарку" кахання.

Запамяталася мне сачыненне Іаанны Нявінскай з Бельска, якая апісала сваю дарогу да беларускасці. Нацыянальную свядомасць перадалі ёй працалюбівыя пакаленні яе продкаў і бацькоў. Праўда, сачыненне „Беларусь і мая сям'я", падпала пад дурную схему. Амаль усе аўтары сачыненняў пішуць пра сваё польска-беларускае паходжанне. Прытым, іх беларус — той, хто нарадзіўся ў Рэспубліцы Беларусь або БССР.

Ёсць некалькі цікавых малюнкаў і фотаздымкаў. Прыгожы малюнак маленькай Соні Сульжык з Гарадка. Соня натхнілася шырокавядомай карцінай „Шпацыр" Марка Шагала. Па віцебскім небе ляціць дзяўчынка з ранцом, найхутчэй — у школу. З аднаго коміна замест дыму выплывае вясёлка. Сярод каляровых будынкаў відна царкву і сінагогу...

Самую арыгінальную падборку фотаздымкаў даслалі гайнаўскія ліцэісткі: Дыяна Койла і Паўліна Мікалаюк. Беларусь спалучылі яны з этна-модай і ідэяй свабоды.

Вядома, найбольшую каштоўнасць кніжка мае для саміх конкурснікаў. Гэта памятка на ўсё жыццё. Для чытача звонку — паказвае нашы адносіны да Беларусі. Бо нягледзячы на крытычныя заўвагі і хібы твораў, дзеці і моладзь думаюць пра Беларусь з сімпатыяй.

ЗОРКА

„Беларускія красачкі", Дыяна Койла і Паўліна Мікалаюк

Музыка з кайфам

Канцэрт у Гайнаўцы

Як напэўна частка з вас добра ведае, у музычным сэнсе сон можа быць белы. Не адзін з вашых бацькоў, а можа і вы самі слухалі песню пад загалоўкам „Белы сон" у выкананні гурту пад такой жа назвай. Але да самога гурту яшчэ вернемся ў недалёкай будучыні. Сёння будзе пра сон у неакрэсленых колерах, затое з канкрэтнай музычнай афарбоўкай.

У цэнтры Гайнаўкі стаяць банк, маркет, управа ды знаходзіцца парк, у якім можна сфатаграфавацца з пушчанскім зубром. Стаім на скрыжаванні вуліц 3-га Мая, Стэфана Баторыя ды Аляксея Зіна. Паміж управай і банкам няма аднак дарогі ў гарадскі парк, а цягнецца там доўгая сцэна, такая доўгая, быццам бы на ёй меў зайграць цэлы аркестр. Аркестра пакуль няма. Нібыта мурашкі мітусяцца людзі з кабелямі, мікрафонамі, ідэнтыфікатарамі, як пры вялікіх фестывалях. Насупраць доўгай сцэны паставілі і меншую сцэну. Там сабраліся маладыя людзі, а за інструментамі — мясцовыя музыкі, якія праводзяць рэпетыцыю свайго вясельнага гурту. Павольна плыве мелодыя песні „Тапаля", зараз аднак эрцашчымныя гукі перапыняе радасны рытм „Смэрэкі". Усе смяюцца, калі гітарыст пачынае іграць „Касіў Ясь канюшыну". „Спяваем разам!" — нехта крыкнуў, як быццам гэта ўжо канцэрт, а не рэпетыцыя. Хтосьці пачаў танцаваць пад гукі песні „Толькі з табою", калі на доўгую сцэну на другім баку вуліцы выйшаў не аркестр, а замежны госць. Вядома, вясельнага калектыву ўжо не было чуваць, а на ўсю Гайнаўку паляцелі гукі песень гурту „Ляпіс Трубецкой"! Проста магутнасць, нечаканы кайф ад мелодыі і гуку. Усе прыпыніліся, стаяць на вуліцах нібыта статуі, без руху, зачараваныя музыкай. Толькі сярод „вясельнікаў" атмасфера свабодная, — то глянуць на сцэну, то пагаварыць, пасмяюцца. У пэўны момант мікрафон пакідае лідар „Ляпісаў", скача са сцэны і пераходзіць на другі бок. Вітаецца з усімі, сядае, пачынае гутарку, нават нешта падспеўвае з мясцовымі. Вялікі канцэрт расплываецца ў паветры, застаецца толькі вакаліст, Сяргей Міхалок. Чамусьці, аднак, ён да сябе непадобны, а нагадвае вакалістаў амерыканскіх гранджавых камандаў, „Alice in Chains" ды „Soundgarden"... Таму, што гэта мой апошні сон, а вядома, што ў снах бывае ўсё па-нашаму ды ўсё наадварот. А Сяргей Міхалок можа быць падобны нават на Мадонну ды найбольш у свеце кахаць песню „Толькі з табою".



i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 39

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 35:

Іна, ас, булка, прыз, прывітнне, асака, кабан, малы, траса. Справа, рыс, бывалы, гузік, так, ікра, ар, неба, Ян, смешна.

Узнагароды, кашалькі з лагатыпам Радыё Рацыя, выйгралі: **Кася Кічкайла, Тамаш Харкевіч, Эва Сакалоўская, Войцех Стыпулкоўскі** з Нараўкі і **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



УВАГА КОНКУРС

XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **15 кастрычніка 2010 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2010 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!!!

Спачуванні

Валянціне БАБУЛЕВІЧ
і яе сям'і
словы шчырага
спачування па прычыне
смерці **яе Маці**
выказваюць

сябры з Сустрэч „Зоркі"
і супрацоўнікі рэдакцыі „Нівы"

БЕЛЬСКІЯ БЕЛЛІЦЭІСТЫ

Ілона КАРПЮК

— Свету тады не бачылі, ён абмежаваны быў да Бельска, Гайнаўкі, Беластока, — кажа Янка Мойсік, журналіст Беларускай рэдакцыі Радыё Ватыкана. — Упершыню пабачыў я Варшаву, калі паехаў здаваць экзамены ў вышэйшую ўстанову.

Янка Мойсік

У Варшаву падаўся ён ў 1974 годзе. Тады ён стаў выпускніком Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ўжо імя Браніслава Тарашкевіча (імя было прынята 5 сакавіка 1969 года). Як многія абсальвенты сваёй школы меў нейкія планы на будучыню. Хацеў паехаць далей вучыцца, а было гэта магчымае, бо ў той час 90% вучняў бельскага белліцэя атрымлівалі індэксы вышэйшых школ ва ўсёй Польшчы. Янка Мойсік хацеў пачаткова паступіць у Вайсковую тэхнічную акадэмію, як брат ды іншыя калегі, але калі той жа брат сказаў, што нашмат больш прыемнасці прынясе яму вучоба ў цывільнай установе, Янка хутка памяняў планы і апынуўся на першым курсе Галоўнай школы планавання і статыстыкі. Там мог, між іншым. працаваць, як шмат іншых студэнтаў, дзякуючы працоўным кааператывам. Пачаў таксама пазнаваць краявіды „дэмалюдаў", аж урэшце трапіў у Вену. Як праваслаўны хадзіў маліцца ў царкву, як пазней аказалася — грэка-каталіцкую, але пры нагодзе спазнаў асяроддзе венскіх украінцаў. А тыя пазнаёмілі яго аднойчы з айцом Робертам Тамушанскім, які працаваў на Радыё Ватыкана. Якраз у той час радыё цярпела на недахоп працаўнікоў беларускай рэдакцыі.

— Я не ведаў італьянскай мовы, толькі нямецкую, якая дазваляла мне свабодна жыць у Вене, — расказвае Янка Мойсік. — Але Ватыкан шукаў тады чалавека, які ведае сваю родную мову, веравызнанне не мела такога значэння як тоеснасць і валоданне роднай, беларускай мовай. Так у 1983 годзе я трапіў у Ватыкан і стаў журналістам. Што цікава, сёння з'яўляюся адзіным праваслаўным журналістам на гэтай радыёстанцыі.

Выпадак дапамог Янку Мойсіку ('74) абраць сваю жыццёвую прафесійную сцежку. Такія ўсмешкі лёсу дапамагалі і іншым, якія працуюць або працавалі ў журналістыцы. А спалучае іх адна школа — беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім. Таму пры кожным прозвішчы знойдзеце ў дужках год яе завяршэння. Год, з якога пачаліся жыццёвыя пошукі ды перарэзалася бельская пупавіна.

Першапачаткова беларуская школа ў Бельску-Падляшскім узнікла ў 1944 г., а пасля трохгадовага перапынку ў 1949 г. нанава пачала працу. Арганізаваў яе дырэктар Яраслаў Кастыцэвіч.

— „Здравствуйте" — чулі на вуліцы вучні, якія сустракалі дырэктара. Ніхто не паспеў ніколі прывітацца першым. Дырэктар ведаў усіх і кожнаму кланяўся. Вельмі яго ўсе паважалі, — успаміналі Валянціна Жэшка ('54), „Нікіцючка", як яе клікаў настаўнік беларускай мовы Ілья Бернат (ад дзявочага прозвішча Нікіцюк).

Валянціна Жэшка была школьнай псотніцай, такім жулікам у спадніцы, можа таму слухаліся яе аднагодкі і часам выкарыстоўвалі гэта настаўнікі. Любіла спорт, хацела працягваць адукацыю ў акадэміі фізкультуры. У ліцэі ездзіла на спаборніцты па стралянні, але больш за мундзір кахала танцавальны касцюм. Па прапанове танцаваць у калектыве

Вера Валкавыцкая

Валянціна Жэшка

Таццяны Гіжэўскай прыехала ў Беласток. Працавала ў Саюзе польскай моладзі і ў банку, але патрэбны быў карэктар у новаўзніклым беларускім тыднёвіку „Ніва". Стала на працу. Так пачала пазнаваць асяроддзе і характар працы ў тадышняй журналістыцы. Хаця здавалася, што выдатна літаратурнай мовай не валодае, то слоўнікі і пастаянная праца над сабой дазволіла працаваць ёй у гэтай прафесіі да пенсіі, а як сама падкрэслівае: „Нашае пакаленне было вельмі абавязковае. Гэта дапамагала".

Пацвярджае гэта Вера Валкавыцкая (Леўчук, '53). Беларускі ліцэй і яго настаўнікі патрабавалі дысцыпліны, але адначасова адчувалася нейкую свабоду.

— Помню словы нашага паважанага дырэктара Кастыцэвіча: „Неважнэ, што па-польску гавораць некаторыя, дух — найважнейшы". І гэты „дух" быў адчувальны ў нашай школе таму, што яна была свойская, наша і добра ў ёй мы сябе адчувалі. Мы не былі горшыя за іншых, за палякаў, католікаў і маглі быць сабою. Так як сабою быў дырэктар Кастыцэвіч. Гаварыў па-руску, але так быў выхаваны і мы гэта разумелі, хаця смешна было, калі казаў „вэльмі добра" з расійскім акцэнтам.

Веры Леўчук марылася настаўніцтва. Паступіла на рускую філалогію, але з-за хваробы не мела шансу працягваць адукацыю. Трапіла на працу ў арлянскую кафлярню і адтуль, можна сказаць, выцягнуў яе артыкул у „Трыбуне люду". Яго і надрукаваны там верш Веры прачытаў сённяшні муж, а тадышні галоўны рэдактар „Нівы" Георгій Валкавыцкі і прывёз яе ў рэдакцыю.

— Лёсу я ўдзячна, што працавала для гэтай вялікай ідэі, якой імя „Ніва". Мне тады свет адкрыўся. Дзякуючы журналістыцы і гістарычным студыям, якія закончыла ўжо працуючы ў „Ніве", я ўмею чытаць! Тая праца давала пачуццё важнасці і рэальнага ўплывання. Можна было абараніць чалавека ды іншым дапамагаць.

Рэдакцыю тыднёвіка „Ніва" будавалі шматлікія выпускнікі бельскага белліцэя. Працягваюць яны спіс журналістаў-белліцэістаў на нейкіх дванаццаць прозвішчаў. Трэба абавязкова пералічыць у ім Лідзію Верабей (Базылюк, '52), Міхася Шаховіча ('72), Янку Беразаўца ('58) ці няштатнага супрацоўніка рэдакцыі Васіля Сакоўскага ('56), якога ліцэйскі, мужчынскі клас, званы „Джунгляй", выдатна адлюстроўваў, а нават даваў новую якасць словам Веры Валкавыцкай пра свабоду ў белліцэі 50-тых гадоў. Аднак не толькі пішучыя людзі ствараюць журналісцкія рэдакцыі. Так было ў выпадку „Нівы", куды пасля сярэдняй школы трапілі на працу між іншымі машыністкі Ірына Троц ('71) ды Марыя Федарук (Дамброўская, '54) і Люба Ігнатовіч ('56), якія працавалі ў сакратарыяце. Там таксама да сёння працуе Галіна Рамашка (Грынявіцкая, '77). Бухгалтэрыяй з 1990 года ў „Ніве" займаецца Марыя Паўлючук (Пракапюк, '74), а ў свой час, побач Валянціны Жэшка, карэктаркай працавала Зофія Стаськевіч (Бусловіч, '55).

Не толькі ў беластоцкай рэдакцыі „Нівы" знаходзіліся выпускнікі бельскага белліцэя. Беласток аказаўся вельмі прыцягальным, можа нават перспектыўным горадам для журналістаў. Хаця ў шматлікіх выпадках шлях да гэтай прафесіі пачынаўся ў Варшаве, то ўсё ж такі роднае Падляшша як магніт прыцягвала дэбютантаў поўных мараў і ахвоты выдзерці для сябе месца ў складанай рэчаіснасці. Пачнем ад тых, якіх наогул не відаць. „Ніўская" дванаццатка ёсць магічнай таксама ў выпадку радыёжурналістаў.

— За першыя заробленыя грошы купіў я сабе рэпарцёрскі магнітафон „Унітры", „МК 125", — распавядае Уладзіслаў Праховіч ('75), прэзас Польскага радыё Беласток. — Можа тады мне ўжо неяк цягнула, запісваў галасы, размовы з бацькамі, з сёстрамі. Але дарога да журналістыкі не была такая простая. У ліцэйскі час я займаўся спортам. Ха-

ПАЙШЛІ Ў ЖУРНАЛІСТЫ

ця я не баскетбольнага росту, то кідаў у кош, а яшчэ і амаль прафесійна ездзіў на ровары. Быў сябрам бельскіх спартыўных клубаў і акадэмія фізкультуры была відавочнасцю. Пасварыўся я, аднак, з трэнерам і закрылі мне абраную дарогу. Добры чалавек падмовіў мяне паспрабаваць паступіць на беларускую філалогію ў Варшаву. Гаварыў я па-беларуску нядрэнна, нават і вершы пісаў, як многія, у стол. Тры чацвёркі на экзаменах — і я стаў студэнтам.

У Варшаве новы студэнт вельмі хутка пацікавіўся працай радыёвузла, можа таму, што ў злосці яшчэ да матуры закінуў спорт. Цікаўнасць і заўзятасць давялі да таго, што на Дзень жанчын у эфіры студэнцкага радыёвузла прагучала перадача Праховіча і з таго часу стаў там не толькі пастаянным госцем, а і гаспадаром „Радыё Смыкі".

— Прапановы працы ў Варшаве былі, але я захацеў вярнуцца. Меў шмат сяброў, у якіх былі кантакты з замежжам і доступ да музыкі, таму запрапанавалі мне, упершыню, працу на Радыё Беласток, тады ў рэдакцыі музыкі. Другі раз вярнуўся ў 1984 годзе, ужо канкрэтна ствараць беларускую праграму, паралельна працаваў у рэдакцыі інфармацыі. І так па ступеньках: стварэнне рэдакцыі меншасных праграмаў, а зараз пасада прэзаса. Кахаю сваю працу і адчуваю сябе прафесійна споўненым.

Анна Шайкоўская ('94) таксама рэалізуецца ў сваёй працы. Працуе навіншчыкам у рэдакцыі Беларускага Радыё Рацыя, таксама ў Беластоку. З Уладзіславам Праховічам спалучае яе не толькі факт вучобы ў Бельскім белліцэі, але яшчэ і першая, запамінальная школьная ініцыяцыя.

— У чацвёрты клас пачатковай школы меў я ісці ў Бельск, — успамінае абітурыент Праховіч. — Падыходзім пад комплекс беларускіх школ, а бацька кажа: „Тут ёсць школа з беларускай мовай. Можа паспрабуеш?". Я на гэта: „З пятага класа будзе расійская мова, то буду ведаць дзве замежныя мовы." — „Гэта не замежная, беларуская гэта твая мова", — адказаў бацька. Хаця ў хаце размаўлялі мы на гаворцы, бацька патлумачыў мне значэнне літаратурнай мовы і я пайшоў у „тройку".

— Найбольш яркі ўспамін гэта першы дзень у ліцэі, — распавядае Анна Шайкоўская. — Здавалася, што з Орлі, дзе гаворыцца па-свойму, пераязджаю ў польскамоўны Бельск. Пераступаю парог школы і чую: „А скуль дзевачка да нас прыйшла?". Гэта быў стораж, спадар Фалькоўскі. Старэйшы чалавек, але такі цёплы, поўны сімпатыі і цікаўнасці да людзей.

У жыцці Анны гэта перад усім сустрэчы з адпаведнымі людзьмі дапамагалі рабіць чарговыя крокі.

— Настаўнікі былі ў нас вельмі патрабавальныя, таму даволі добра іх памятаецца, а асабліва спадарыню Зіну Дэмянюк (Красоўскую) ад беларускай мовы. Шмат чаго навучыла, адкрыла мне літаратуру, Быкава. Пасля свабодна я вучылася на беларускай філалогіі ў Беластоку.

Раней Анна марыла пра юрфак, але не хапіла адвагі здзейсніць гэтую мару. Яе жыццём стала журналістыка, у якую трапіла з конкурсу.

— Прачытала ў „Ніве", што шукаюць людзей да працы на Радыё Рацыя. Вырашыла паспрабаваць, хаця па адукацыі я настаўніца. Сёння ведаю, што гэта быў лепшы выбар. Журналістыка дае магчымасць развівацца, дае задавальненне.

Янка Мойсік трапіў у Ватыкан. Ніна Баршчэўская (Амельянюк, '75), навуковы працаўнік Варшаўскага ўніверсітэта, узначальвае Беларускую рэдакцыю V праграмы Польскага радыё. У V праграме Польскага радыё для журналістыкі запісаліся таксама Іаанна Куна ('88) ды Іаланта Смялоўская (Марціновіч, '88). Анна Шайкоўская не думала пакідаць Падляшша. З Аняй на Радыё Рацыя працуюць яшчэ Валянціна Лаеўская раней

Маргарыта Пракапюк

Юрка Каліна

Радыё Свабода ('79), Міхась Стэпанюк таксама зараз супрацоўнік „Нівы" ('2003), Лукаш Стэпанюк ('96), Яраслаў Іванюк — зараз праграмны дырэктар Радыё Рацыя ('88), Віктар Стахвюк (Стахіюк, '66), Галіна Бэдэнічук (Сідарук-Сідорская, '90). На Радыё Беласток, апрача прэзаса Праховіча, сустракаюцца абітурыенты ліцэя 70-тых і 80-тых гадоў: Яўген Рыжык ('78) з украінскай рэдакцыі, Марко Заброцкі ('87) — беларуская рэдакцыя, Славамір Сакалоўскі ('88), актуальна па-за Беластокам ды Юры Ляшчынскі ('83) — беларуская рэдакцыя, сузаснавальнік студэнцкай старонкі „Прысутнасць", па сённяшні дзень таксама ніўскі аўтар).

— У наш час па белліцэі кружылі ўжо толькі міфы пра „Разбуджаны голас", газету, якую ствараў між іншымі Юрка Ляшчынскі, але ў нас такой актыўнасці не было, — прызнаецца Юры Каліна, журналіст беластоцкага асяродка Польскага тэлебачання ды тэлеканалу Белсат, сузаснавальнік „Часопіса" і яго сакратар. — Ад нас перад усім патрабавалі. На ўроках прафесар Бялецкай мы нават млелі, але сёння гэта толькі ўспаміны. Я шмат тады чытаў, „Кантрасты", „Ніву". У „Ніву" пісаў у „Сэрцайка" як Кастусь. Гэта былі мае першыя спробы. Любіў пісаць, але складанасці лёсу і дэмакратычных перамен, а можа шансы таго часу, дапамаглі праз розныя прафесійныя досведы трапіць нарэшце на тэлебачанне.

Не толькі Юры Каліна вучыўся медыяў разам з развіццём тэлевізійнага асяродка ў Беластоку. Сваіх магчымасцей паспрабавала таксама малодшая сяброўка, Маргарыта Пракапюк ('93).

— Госю мы ўпершыню здымалі дзесьці пад квітнеючай вішняй у Гарадку, — успамінае Юрка Каліна.

— Дзесьці за клуняй гэта было, — смяецца Маргарыта. — Здавалася, што гэта такое складанае, а зараз пасля гадоў ужо такое натуральнае. У той час я паддавалася чарговым падзеям. Пачынала ад беларускіх тэлеперадач, бо такія былі магчымасці, а я вельмі актыўна ангажавалася ў беларускі рух. Сустракала адпаведных людзей, якія намовілі мяне на беларускую філалогію ў Варшаве. У новым асяроддзі паявіліся новыя магчымасці і так пакацілася кар'ера.

Маргарыта ўспамінае вельмі эмацыянальна час школы, да якой у яе вялікі сантымент, але і рашучая ацэнка.

— Здаецца мне, што перадавалі нам кавалак беларускага скансэну, а маладыя людзі патрабавалі іншага падыходу да беларушчыны. Уразіў мяне аднак Андрэй Сцепанюк, сённяшні дырэктар белліцэя, які прыйшоў вучыць адразу па студыях. Паказаў, што для нас свет адкрыты, што беларушчына можа мець іншы твар чым нам паказвалі. Спадзяюся, што сёння беларускі характар школы і спосаб навучання дапамагае абараняць сваю тоеснасць і не саромецца, бо наша беларускасць хутчэй прыносіць нам шансы. Таму я свой сцяг вырашыла несці высока.

Маргарыта Пракапюк і Анна Шайкоўская беларускасць адкрывалі для сябе таксама праз прызму пераменаў, якія адбыліся ў Беларусі ў пачатку 90-тых гадоў.

— Гэта быў важны фактар, — лічыць Маргарыта. — Тым больш, што пасля прыйшло вялікае расчараванне, бяссільнасць.

— Не магла паверыць, што прафесараў, якія паяўляліся ў нас у час студыяў, рэпрэсавалі за тое, што абараняюць нацыянальныя сімвалы, — дадае Анна.

Анна і Маргарыта — абсальвенткі амаль таго самага перыяду, абедзве ў журналістыцы, ды ступалі іншымі шляхамі.

— Прыемна, калі тут на Беласточчыне мяне пазнаюць у твар, гэта дае сатысфакцыю, — каментуе Маргарыта Пракапюк. — Але ў Варшаве я лічу сябе сярэдняй журналісткай, там іншыя ўмовы працы. Люблю аднак камеру, а журналістыка гэта цудоўная прафесія.

З тэлебачаннем свой шлях звязалі або часам ім ступалі таксама іншыя: Андрэй Тафілюк ('88), Анна Ігнацюк ('83), Іаланта Адамец ('76), Веслаў Раеўскі ('77). Нельга забыць таксама асобу Мікалая Нестаровіча ('58), выдатнага фільмавага і тэлевізійнага аператара. Ёсць і такія, якія займаюцца інтэрнэт-журналістыкай. Прафесійнымі падзеямі ў Польшчы і іх прысутнасцю ў інтэрнэце займаецца Яцак Пракапюк ('91), а Яўген Андраюк ('75) адсочвае і каментуе валейбольнае жыццё.

Маем свядомасць, што сабраць усе прафесійныя кар'еры бельскіх абсальвентаў, якія пайшлі ў журналістыку, гэта выклік і можа не ўсіх мы тут пералічылі. Не злуйце, а напішыце ў рэдакцыю „Нівы" свой расказ пра шлях да журналістыкі. Не ўсе вашыя сябры пра вашыя лёсы ведаюць, а як паказваюць размовы — жыццё неаднойчы журналістыку прынесла на крылах лёсу.

Юрка Ляшчынскі

Уладзіслаў Праховіч


Валянціна Лаеўская


Яраслаў Іванюк

Віктар Стахвюк


Галіна Бэдэнічук


Анна Шайкоўская


Лукаш Стэпанюк


Міхась Стэпанюк

„Я смела прайшла праз нажы і крыжы...”

Сяргей ЧЫГРЫН

Збор твораў у двух тамах выдатнай беларускай пісьменніцы Ларысы Геніюш (1910-1983) выдадзены ў Мінску да 100-годдзя з дня яе нараджэння. Гэты двухтомнік — самае поўнае, жанрава разнастайнае, тэксталагічна апрацаванае і пракаментаванае выданне спадчыны паэткі. Прэзентацыя двухтомніка адбылася 7 жніўня ў Зэльве на прыступках Раённага дома культуры, бо ў залу гэтай культурнай установы людзей не пусцілі.

Першы том Ларысы Геніюш склалі вершы і паэмы, скампанаваныя храналагічна — паводле выдадзеных пры жыцці аўтаркі кніг і тэматычна — на аснове пасмяротных публікацый.

У першыя чатыры раздзелы ўвайшлі выбраныя творы з трох прыжыццёвых зборнікаў — „Ад родных ніў” (Прага 1942), „Невадам з Нёмана” (Мінск 1967), „На чабары настоена” (Мінск 1982), а таксама са зборніка „Вершы 1945-1947 гг.”, які быў надрукаваны ў Лондане ў 1992 годзе па рукапісе, падрыхтаваным яшчэ самой аўтаркай.

Зборнік „Ад родных ніў” укладаўся і рэдагаваўся Вітаўтам Тумашам — рэдактарам газеты „Раніца” (1942-1943), праз якую прайшлі амаль усе вершы пражскага зборніка. Дарэчы, у 1993 годзе ў Слонімскай друкарні выйшла факсімільнае выданне гэтага зборніка накладам у 3 тысячы асобнікаў.

„Невадам з Нёмана” рэдагаваў Уладзімір Караткевіч, які дзеля гэтага прыязджаў у Зэльву і жыў у доме Геніюшаў. Машынапіс зборніка з ягонымі праўкамі захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Падрыхтоўкай да друку зборніка „На чабары настоена” займалася паэтка Данута Бічэль, з якой у Ларысы Геніюш былі даўнія сяброўскія адносіны.

У раздзел „З беласмертнай Поўначы” укладальнік кнігі Міхась Скобла ўключыў вершы на лагерную тэму, якая займае істотнае месца ў творчасці паэткі. У ім сабраныя творы з пасмяротных кніжных і часопісна-газетных публікацый. Назва раздзела падказаная радкамі Ларысы Геніюш: „Я іду беласмертнай Поўначчу руку смелую вам падаць” (верш „За Урал сонца ўпала, бы зарава...”).

Раздзел „Скарбы слоў” складаецца з твораў, апублікаваных у кнігах паэткі „Белы сон” (1990; укл. Барыс Сачанка), „Маці і сын” (1992; укл. Ян Чыквін), „Выбраныя вершы” (1997; укл. Мікола Раманоўскі), „Выбраныя творы (2000; укл. Міхась Скобла).

У раздзеле „Кліч Пагоні” сабраныя вершы з перыёдыкі, якія ніколі раней не ўключаліся ў кніжныя выданні. Асаблівую каштоўнасць маюць перадрукі з маладаступных крыніц. Прыкладам, камплект згаданай газеты „Раніца” маецца толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, ды і то ў выглядзе мікрафішаў.

І, нарэшце, раздзел „З архіўнай сховані” цалкам складаецца з твораў, якія ў двухтомніку прыходзяць да чытача ўпершыню. Гэта 72 вершы, выяўленыя ўкладальнікам у архіве паэткі ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Асабліва ўражваюць чатырохрадкоўі паэткі. Яны — паэтычныя сімвалы, эпіграфы і нацыянальныя выслоўі, якія павінен ведаць кожны беларус.

Другі том юбілейнага двухтомніка Ларысы Геніюш складаецца з двух раздзелаў — „Проза” і „З эпісталярнай спадчыны (1943-1983)”. У празаічны раздзел увайшлі аўтабіяграфічны нарыс „Сто ранаў у сэрца”, які ў кніжных выданнях не друкаваўся, і дакументальная аповесць „Споведзь”. У эпісталярным раздзеле друкуюцца 160 лістоў паэткі да знаёмых і сяброў, большая частка з іх — упершыню. Гэта чацвёртая значная публікацыя яе надзвычай ёмістага эпісталярыю, з часткай якога чытач ужо мог пазнаёміцца ў ранейшых выданнях.

У пісьмах шмат згадваецца і пра людзей Беласточчыны, беларусаў Польшчы. Найбольш шчырыя і вялікія лісты Ларыса Геніюш пісала Зосьцы Верас. Вось радкі з пісьма Зосьцы Верас ад 5 красавіка 1967 года: „Вельмі цешуся, што с. Ластаўцы лепей са здароўем. Выглядае ён даволі молада, і вельмі хочацца, каб яшчэ пажыў і папрацаваў. Адведалі мы яго з Віктарам Шведам, быў вельмі рад нашай візіце. Хадзіў асцярожна, быў бледны, крыху еў і выпіў з намі нямнога віна. Жонка забаўлялася з унукам, а пасля выйшла з ім на спацыр. Крыху гутарылі, я спяшалася ў Варшаву, бо адзін мой сябра меўся заехаць па мяне, сябра на вельмі высокім становішчы. Сябра Ластаўка быў маўклівы і ціхі, але навокал настрой быў такі „душны”, што мне хацелася хутчэй уцячы. Калі я па дарозе назад амаль не магла аказацца, дык сябра Швед расказаў мне вельмі нецікавы абраз з жыцця с. Ластаўкі, яго паважную хваробу, абыякавыя адносіны сям’і, яго страх за бібліятэку і г.д. Гаварыў нават, што дзе якіх рэчаў ужо ў ёй не хапае. Не хапае і маёй кнігі, якую ў яго „пазычыў” с. Бурш. Бурш, аднак, быў такі шчыры ў сваім гэтым „граху” (у якім не каяўся), што давялося мне падпісаць яму тую кнігу...”.

У пісьме да Зоські Верас ад 17 чэрвеня 1967 года Ларыса Геніюш зноў прыгадвае Пятра Ластаўку, а таксама Адама Быкоўскага (у каментарыі Міхась Скобла папраўляе і ўдакладняе, што гэта насамрэч быў Адам Бычкоўскі, які нарадзіўся на Беласточчыне — С. Ч.). Ларыса Геніюш піша: „Хачу і магу Вас поўнасцю супакоіць, што да здароўя і лёсу П. Л. На днях атрымала ад яго ліста. Са здароўем сапраўды многа лепей, так што нават працуе. Таксама піша мне аб А. Бычкоўскім. Гатуе ў „Ніву” матэрыял аб ім, дапрацоўвае ягоную п’есу „Сваты”. Гэта па 30 гадох пасля смерці. Я думаю, што П. Л. ужо паспеў напісаць і Вам, даражэнькія. На ўсякі выпадак, каб Вы мелі да каго звярнуцца ў Варшаве, я Вам пішу адрас В. Шведа... Пішучы да Шведа (да яго ў гэтай справе пісаць можна шчыра), паклікайцеся, калі ласка, на мяне...”.



Пэўна прадстаўніку кожнай нацыі прыемна чуць паведамленні аб тым, што ў якой-небудзь іншай краіне з’явілася суполка ягоных землякоў, якія рупяцца, каб іх мова, культура і гісторыя былі вядомыя і на чужыне. У дачыненні да беларусаў такія звесткі значна больш прыемныя, асабліва зважаючы на тое, што ў самой Беларусі беларушчына перажывае пярыяд суцэльнага заняпаду.

Вось і нядаўна, прыйшоў у рэдакцыю „Нівы” электронны ліст, дзе паведамлялася, што ў Эстоніі ёсць нашыя землякі, якім залежыць на захаванні і развіцці там беларускага асяродка. Пры гэтым асноўны акцэнт робіцца на прапаганду творчасці слыннага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Гэта бачна па тых сайтах, якія прапануецца наведаць https://sites.google.com/site/bibliotekaimvlkorotkevica/home і https://sites.google.com/site/belorusskaavoskresnaaskola/.

„З кастрычніка 2010 года ў Таліне пачынае працаваць Нядзельная школа беларускай культуры ім. Уладзіміра Караткевіча і Грамадская бібліятэка беларускай літаратуры ім. Уладзіміра Караткевіча. Гэтым крокам мы не толькі дапамагаем развіццю беларускай культуры ў Эстоніі, дзе пражывае каля 14 тысяч беларусаў, але і ўшаноўваем памяць нашага славутага пісменніка ў юбілейны год яго нараджэння”, — піша ў сваім лісце старшыня тамашняй Асацыяцыі Еўрапейскіх грамадзянскіх ініцыятываў Артур Цурбакоў.

Такую ініцыятыву кожнаму свядомаму беларусу, пэўна, трэба толькі вітаць. І зразумела, рука так і цягнецца клікнуць на даныя гіперспасылкі, каб хутчэй даведацца аб выніках рупліўцаў у карысць беларушчыны ў Эстоніі. І ўсё там вельмі добра, за выключэннем аднаго...

З першага погляду на сайты ўсведамляешь, што над імі працавалі людзі, якія ведаюць сваю справу. Выдатны інтэрфейс, зручна пададзеныя выйсці на разнастайныя шматлікія рубрыкі, аздабленне фотаздымкамі — усё гэта прысутнічае на сайтах. Адсутнічае там адзін з галоўных чыннікаў — беларуская мова. За выключэннем пары-тройкі асобных сказаў па-беларуску, усё астатняе выкладзена на рускай мове.

Праўда, калі пазнаёмімся з некаторымі матэрыяламі сайтаў, то ўсвядомім, што сённяшнія беларусы ў Эстоніі амаль спрэс зрусіфікаваныя. Пэўна, з гэтых прычын вельмі цяжка знайсці артыкулы па-беларуску, бо ўсё з большага прызначана для тамашняга „спажывання”. Аднак паўстае пытанне, а ці нельга было б зрабіць дзве моўныя версіі? Гэта, з аднаго боку, спрыяла б авалоданню роднай мовай тых эстонскіх беларусаў, якія яе забылі, а з другога — развівала б пачуццё павагі да яе з боку як беларусаў, так і эстонцаў.

Нягледзячы на такія хібы, з’яўленне нядзельнай школы і бібліятэкі можна акрэсліць як станоўчы факт. Тым больш, што як пішацца на сайце школы, „первый этап годичной программы воскресной школы направлен на изучение национального языка до степени полного понимания (пассивного владения языком) и знакомство с культурой и историей страны. Второй этап должен продвинуть слушателей школы к активному владению белорусским языком в некоторых областях быта и углубленному изучению выбранных учениками направлений истории и культуры”.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Радасць і трывога

Настольны тэніс — адзін з сама спецыфічных і дэмакратычных відаў спорту. У яго могуць гуляць і маладыя, і старыя, людзі з выдатным зрокам і блізарукія. Невыпадкова прыклады „доўгажыхарства” нават на прафесійным роўні ў пінг-понгу нярэдкія. Узяць хоць бы беларуса Яўгена Шчацініна, які больш дваццаці гадоў змагаецца за гонар краіны на розных турнірах. Іншы наш тэнісіст — Уладзімір Самсонаў — увогуле ўнікум. Нетрадыцыйна склалася кар’ера і Віталя Нехвядовіча, які ўжо ў зусім дарослым веку выйшаў на сваю вяршыню. Бяда ў тым, што за плячыма гэтых трох амаль нікога. А перамогамі ветэранаў галоўны чалавек у беларускім настольным тэнісе Аляксандр Пяткевіч прыкрывае катастрафічную сітуацыю з рэзервам. І пры тым агрэсіўна ставіцца да кожнай праявы журналісцкай крытыкі. Можа дайсці да таго, што Беларусь, як і многія іншыя еўрапейскія дружыны, натуралізуе ў свой склад пару кітайцаў ці карэйцаў. Такая заганная практыка ўжо прывяла да сітуацыі, калі чэмпіянат Еўропы фактычна пераўтвараецца ў азіяцка-еўрапейскі спабор. Так было і на першынстве, якое днямі завяршылася ў чэшскай Астраве.

Адразу зазначу, што беларускія прадстаўнікі дасягнулі на форуме бліскучага поспеху. У камандавым мужчынскім турніры нашая каманда трэці раз у гісторыі выйшла ў фінал. У 1/4-й фіналу Беларусь чакаў адзін з фаварытаў — Аўстрыя. Самсонаў выйграў абодва свае матчы, а вырашальнае ачко ў драматычным спатканні прынёс Шчацінін — агульныя 3:2. У паўфінале было лягчэй, паколькі Шчацінін выйграў першы спабор, а далей сваё ўпэўнена ўзяў Самсонаў — выніковыя 3:1. Павал Платонаў і Нехвядовіч на трэціх нумарах свае паядынкі на гэтых стадыях прайгралі. У фінале давялося змагацца з магутнымі немцамі. У 2003 годзе ў Італіі нашы дасягнулі гістарычнай вікторыі. Была ў дачыненнях і параза ў бітве за золата. Зараз, бадай, шанцаў на першае месца не праглядвалася. Ужо першы мікраматч Самсонаў прайграў Крыстыяну Зюсу — 2:3. Амаль усё стала ясна. Затым Шчацінін спрабаваў адбіцца ад Ціма Боля, але сілы былі няроўныя — 1:3. Прывідная надзея яшчэ заставалася. Платонаў „зліў” дзве партыі Патрыку Баўму, потым страпянуўся і гэтак жа ўпэўнена ўзяў два сеты, але ў вырашальны момант здаўся — 2:3 і выніковыя 0:3. Тым не менш, кантынентальнае серабро — вялікі поспех. Што датычыць немцаў, то яны дамінавалі і ў іншых разрадах. Так, у паўфінале адзіночнага турніру іх было ажно трох. „Сваё” месца там не заваяваў Самсонаў, саступіўшы ў чвэрцьфінале Баўму — 3:4.

Беларусь стала адзінай краінай на турніры, якая ўзяла камандавыя медалі і ў мужчынскім, і ў жаночым разрадах. Нашы дзяўчаты ў чвэрцьфінале з цяжкасцю адолелі „кітайскую” Турцыю — 3:2. Прычым цягам матча „гарэлі” 0:2. Але затым Аляксандра Прывалава і сёстры Паўловіч здзейснілі эфектны камбэк — 3:2. У паўфінале беларускія дзяўчаты саступілі „фальшывым” галандкам — 0:3. Але паколькі матч за 3-е месца па рэгламенце не праводзіцца, атрымалі бронзавы медалі. Гэта першая камандавая ўзнагарода беларусак на кантынетальных чэмпіянатах.

Галоўнай жа гераіняй з нашых стала Вікторыя Паўловіч. Яна паслядоўна ўзяла верх у 1/8-й фіналу над Кіянь Лі з Польшчы — 4:2, у 1/4-й — над Геаргінай Потай з Венгрыі — 4:0, у паўфінале — над Мелек Хю з Турцыі — 4:2. А ў фінале выйграла ў кітайкі з Аўстрыі Цзя Лю — 4:3.

Сапраўды ёсць чым пацешыцца, але ўсе заваёвы дасягнутыя праверанымі гадамі майстрамі. А вось заўтрашні дзень нічога добрага Беларусі ў настольным тэнісе не прынясе. Пара думаць пра змену!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Маем жаль

Чытаючы тыднёвік „Ніва” ад 25.07.2010 г. у пошках праўды і ад 5.09.2010 г. — адгалоску да „Падводнай лонкі”, хочам растлумачыць наступнае.

Міра Лукша, на нашу думку, напісала няпраўду. Мы пачуліся абражанымі. Быццам мы, Яўген Смольскі і Мікалай Стоцкі, узялі грошы за выўлашчанае агульнае пасбішча, дзялілі суседзяў, прытым прысабечылі сабе. Такія абвінавачанні можа рассудзіць суд.

Усе справы звязаныя з высяленнем былі нам накінуты адміністрацыйна. Павятовая геадэзія ў Гайнаўцы ў 1965-70 гадах вызначыла кожнаму велічыню пая з гэтага агульнага абшару. Пры „выўлашчэнні” грашавы кошт кожнаму аддзельна налічала Ваяводская ўправа ВЗІР у Беластоку. Кожны быў павядомлены аддзельна. Грошы плаціў Кааператыўны банк у Нараўцы.

Трэба адзначыць, што вёскі Лука і Слабодка атрымалі царскім указам у 1864 годзе грунты 400 гектараў, выдзеленыя з маёнтку Тарнопаль уласніка Людвіка Бялінскага. У гэтым наданні кожная вёска атрымлівала аддзельнае супольнае пасбішча. Тою супольнасцю маглі карыстацца тыя гаспадаркі, якія атрымалі надзеленыя грунты. Мы паважаем рашэнні царскага дэкрэта. Абараняем сваю ўласнасць.

Праўды шукайце ў архівах.

Мікалай СТОЦКІ

Шаноўныя лучане!

Разумею, што крыўдна Вам за тое, што справа ўвогуле кранулася. Калі ласка, працытуйце дакладна мой допіс слова ў слова — там дакладна стаіць: «Мяркую, што вы падзялілі паміж усімі ўсё сумленна». Дык справа Вашых суседзяў-лучан вырашана і да гэтага ніхто не мае прэтэнзіі з жыхароў былое Лукі. Калі гаворка пра карты, і архівы — «карты ёсць, выдзеленая лучанская супольнасць-паша, і луг які купілі продкі м.інш. спадара Казберука». Не пярэчыце ў тым, што дзед Клаўдзія Казберука і чатырох яго суседзяў купілі той луг у 17 гектараў перад II вайною, бо за гэта заплацілі грошы, што ёсць у захаваных дакументах — у натарыяльным акце куплі ды ў кадастравых кнігах у Гродне. Калі спасылаемся на царскія дакументы, дык сумленна было б і на тыя з наступнага стагоддзя. Калі вы змагаецеся за сваю ўласнасць, дык такое самае права на гэта мае і спадар Казбярук. Ён жа ж, як і вы, невінаваты ў тым што адміністрацыйна адабралі ў вас родную зямлю.

Міра ЛУКША

У НІЎСКІМ фотааб’ектыве

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Надпіс над уваходам на могілкі ў Астрожанах

У Трасцянцы страляюць

Мікалай ЛУК’ЯНЮК

Нядаўна давялося пабываць мне ў вёсцы Трасцянка Нарваўскай гміны Гайнаўскага павета. Калі я спытаўся ў пенсіянераў, як ім жывецца, дык пачуў адказ, што калі б не было яшчэ горай як цяпер, дык можна было дажыць спакойна да канца свайго жыцця.

Ды пачалі яны скардзіцца, што ім няма спакою ноччу! Бо гэтак званы „баўэр” Тамаш Грынявіцкі і яго цесць Веслаў Катовіч парушаюць іх начны спакой.

Калі ўзязджаць у вёску Трасцянку ад Заблудава, бачым там пабудаваную імі вялікую сельскагаспадарчую ферму. Там гадуюць курэй, гусей ды мясное быдла. Поле купілі з дзяржаўнага фонду, а рэшту ўзялі ў арэнду па былым трасцяніцкім калгасе і яе абсяваюць збожжам на пашу для жывёлы. Вялікую частку палеткаў абсяваюць кукурузай. А вядома, што кукурузай любіць карміцца дзікая звярына — дзікі, алені і ласі. Фермачы купілі на шкоднікаў стралочныя, выбуховыя і аўтаматычныя матэрыялы, якія страляюць у розных месцах у полі. Выстралы гучаць як стралянне з дубальтоўкі. Ноччу людзі прачынаюцца ад такой страляніны і не могуць заснуць.

Я не ведаю, ці гэта добра, але я адказаў трасцяніцкім песніянерам за народнай прыказкай, што „я сваю Кацярынку магу пацалаваць сярод рынку” і мяне ахоўнікі парадку не пакараюць. Таксама спадары Грынявіцкі і яго цесць на свам полі маюць права на тое, каб палохаць выстраламі дзікую жывёлу, што нішчожыць ім ураджай.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Аскара Уайльда.

1. фундамент, апора = 27 _ 57 _ 56 _ 11 _;
2. раённы цэнтр на Дняпры між Клічавам і колішнім Прапойскам = 12 _ 13 _ 60 _ 61 _ 51 _;
3. пара органаў зроку = 22 _ 42 _ 33 _ 34 _;
4. апошняя эра ў геалагічнай гісторыі Зямлі = 45 _ 36 _ 37 _ 6 _ 7 _ 24 _ 28 _ 29 _;
5. палач = 47 _ 48 _ 41 _;
6. кіслы цытрусовы плод = 49 _ 50 _ 8 _ 9 _ 35 _;
7. сталовы прыбор для зачэрпвання ежы = 20 _ 23 _ 10 _ 58 _ 59 _;
8. праміль ад мільярда = 1 _ 21 _ 43 _ 44 _ 52 _ 54 _;
9. дванаццаты месяц = 19 _ 62 _ 40 _ 30 _ 31 _ 32 _ 15 _;
10. левы прыток Дзвіны, што ўліваецца ў Бешанковіцкім раёне = 2 _ 39 _ 38 _;
11. жончына маці = 14 _ 55 _ 16 _ 17 _ 18 _;
12. гмінная мясцовасць між Орляй і Нарвай = 4 _ 5 _ 3 _ 63 _;
13. імя Цэзара = 26 _ 25 _ 46 _ 53 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 35 нумара

Грым, града, Кюсю, ртуць, джын, арыя, сто, іней, цар, аўт, Лельчыцы, Астана, цюбік, цынік, выхад, вусач, зарплата, ГАІ, джыгіт.

Рашэнне: **Адсутныя ніколі не маюць рацыі, але часта астаюцца ў жывых.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму.**

26.09 — 02.10

(22.03. — 20.04.) Забудзься пра непрыемныя справы. Ды цяжка будзе паразумецца нават згоднай пары. У выпадку праблем, не гарачыся і не тупачы, бо амаль кожнае змаганне можа не прынесці плёну. Не жыві над стан.

(21.04. — 21.05.) Калі вядзеш сваю фірму, можаш спядзявацца харошых прыбыткаў. Папраў адносіны з найбліжэйшымі і ўсіх трактуй аднолькава. Не выдавай усіх сваіх ашчаднасцей. Не занядбоўвай нават маленькіх нямогласцей, асабліва касцей і пазваночніка.

(22.05. — 22.06.) Можаш разлічваць на замежнікаў. Настрой надалей выдатны. Плануючы выдаткі ці пазыкі, карыстайся паслугамі праверaных фірмаў. Будзеш цяпер больш адкрыты, пашукаеш добрай кампаніі і забавы (будуць нагоды!).

(23.06. — 23.07.) Будзь вельмі асцярожны на вуліцы і пры электратоку. Пазбягай крэдытаў і падазроных гандлёвых прапаноў. Хоць добра ўвесь час у фінансах. Пераканаешся, што няма чаго капацца ў кепскіх успамінах і паддавацца згрызоце.

(24.07. — 23.08.) Добра часам пайсці па параду да асобы, у якой погляды зусім іншыя чым твае. Ды не давярай залішне людзям (небяспека міне каля 28.09.). Нянудна і ў старых парах. Добры час на ўпрыгожваючыя, касметычныя працэдуры.

(24.08. — 23.09.) Фантастычны час у фінансах, дзякуючы твайму шчасцю і заслугам. Ды не вельмі будзе хацецца табе выдаваць грошы. Не вывaрочвай усяго дагары нагамі. Дзевы, пачынаючыя працу зя мяжой, хай не нервуюцца дробнымі праблемамі; усё будзе добра. Цяжка зажываючыя раны лячы раслінными мікстурамі.

(24.09. — 23.10.) Не хваліся; хтось зайздросны зробіць усё, каб папсаваць табе настрой. Шалі з 27-30.09. адчуюць горыч таксічнага ці страчанага кахання. Пастаў на тое, за што здабудзеш прызнанне (не мусяць гэта быць вельмі амбітныя праекты, якія, дарэчы, лепш адкласці на пасля).

(24.10. — 22.11.) Зваліцца табе на галаву мноства бюракратычнай і чыноўніцкай драбязы. І можа не хапіць табе ветлівасці ў адносінах да асобы, якая не шануе твайго часу. Калі пуста ў кашальку, не думай аб бядзе, а аб павышэнні кваліфікацый. Ды не загароўвайся, бо стома — твой найгоршы вораг. Можаш апынуцца ў нявыгаднай сітуацыі; адчакай.

(23.11. — 22.12.) Будуць біць фантанам з цябе новыя ідэі. Знойдзеш спрытнае вырашэнне кожнай праблемы. Хуткія змены сітуацыі, але будзе свабадней чым тыдзень таму. У старой пары партнёр можа паставіць цябе пад сценкай.

(23.12. — 20.01.) Калі не спраўляешся з сітуацый, не тлумач іншым, што ўсё трымаеш пад кантролем. Прытвараючыся, будзеш мець вакол сябе таксама няшчырых людзей. Студзеньскія Казярогі стануць ахвярай уласных падазрэнняў. Не вырашай важных спраў у самоце.

(21.01. — 19.02.) Адчуеш прыліў пачуццяў. Ды самотны Вадалей хай кантралюецца, захавае прытомнасць і не страчвае галавы. Спрэчкі з калегамі на працы; будзеш вельмі раздражнены. Гумар і досціп — твой шчыт. Не паддавайся кулінарным „пэхам”, бо паправішся і зашкодзіш пячонцы і шчытавідцы.

(20.02. — 21.03.) 26-30.09. будзеш прымушаны абраць зусім іншы шлях, які не мусіць быць кепскі, ды можаш не заўважыць гэтага ў пару. Прытрапяцца добрыя выпадкі ў прафесіі, што прынясе шанц на поспех. Самотныя Рыбы хай звернуць увагу на Дзеву.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

УСПАМІНЫ З НАРАЎЧАНСКАЙ ЗЯМЛІ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Як штогод, Таварыства сяброў Нараўчанскай зямлі арганізуе конкурс успамінаў з роднай зямлі — „Нараўчанска зямля — людзі і факты". Сёлета ўдзельнікаў было менш — не хапала перш за ўсё шматліка раней рэпрэзентаваных вучняў з нараўчанскіх школ. 17 верасня ў галерэі імя Тамары Саланевіч адбылося завяршэнне конкурсу, на які прыбыло шмат членаў таварыства (з якіх вельмі многа не пражывае пастаянна ў Нараўцы і ў ваколіцах) ды пераможцы — Янка Целушэцкі з Новага Ляўкова і Мікалай Варанецкі з Альхоўкі. Імёны вядомыя, пра што ўспомніла старшыня таварыства Вольга Зданоўская-Місеюк, прыгадваючы супрацоўніцтва пераможцаў між іншым з „Нівай". Абодва аўтары не толькі дасылаюць у нашу рэдакцыю свае допісы з Нараўчанскай гміны, але і дэбютавалі на старонках „Нівы" як аўтары вершаў. Іхнія працы — „Ляўкова паўстагоддзя таму" Я. Целушэцкага і „Нараўчанскія помнікі" М. Варанецкага таварыства выдала ў маленькіх зборнічках. Будуць яны таксама друкавацца ў газеце „Wieści Podlaskie".

Зборнічак Янкі Целушэцкага можна назваць успамінамі, часам вельмі лірычнымі. „Дачакаўся я 65 вясны майго жыцця.(...) Паўстагоддзя таму якой жа іншай была мая радзімая вёска Новае Ляўкова! Іншая была таксама рака Нараўка і рэчка Баброўка. Баброўка плыла за стадоламі Жукоўскіх, Інгацюкоў, Пучынскіх, Леўчукоў, Сахарчукоў, Грыгарукоў, Скепкаў, Красноўскіх, Несцерукоў і Галубоўскіх. Найстарэйшых з іх ужо скрышыў час. (...) На гэтай тэрыторыі былі варонкі ад бомбаў, м.інш. на лузе маіх бацькоў. Нямецкі пілот бомбу кінуў на лугі, абмінуў вёску. Апошнюю бомбу скінуў на Лешукі. (...) На рэчцы (...) з драўлянага моста лавілі мы рыбу на вуды. З кломляй хадзілі на шчупакі. Рыб было 6-7 відаў. У Новым Ляўкове былі двор і грэбля. Насыпалі яе ў сувязі з водным млыном. Дворскія лугі былі за ставамі (...). Пры дарозе з Нараўкі ў Новае Ляўкова, побач моста на рацэ Баброўцы, стаяў вялікі вятрак. Выбудавалі яго на пагорку Закшэўскія (...). Хто сёння памятае, што паблізу гаспадаркі Несцерукоў Баброўка ўпадала ў стаў. Жыхары Ляўкова называлі яго „бухтай". Маю яго на здымку, які зрабіў фотаапаратам „Друг"..." І далей працяг — пра тое, які злавілі ў бухце „каралеву-матку" рыб — аграмадную плотку. „Прыгажэйшай рыбы я не бачыў за ўсё жыццё! (...) На правым беразе Нараўкі была ўтаптаная сцежка. Сюдою хадзілі рыбакі. Найбольш іх збіралася пры зыходзе Баброўкі і Нараўкі, месца гэтае звалі „Ралы". Рэдка пакідалі гэтае месца гарачыя вудзільшчыкі — Толік Несцярук, Толік Баканач, Сяргей Казлоўскі і Рыгор Бельскі. (...) Нараўка плыла ціха і спакойна, несучы свае воды ў бок Капітаншчыны, Касьяноў і Біндзюгі. (...) Час плыве як рэчка. Змеліяравалі лугі над Баброўкай. На вуліцы паклалі брук. Вёску электрыфікавалі. Пабудавалі керамічнае прадпрыемства. (...) Сёння ў Ляўкове няма школы (зачынілі яе ў чэрвені 2010 г.) Ад 1 красавіка 2010 года ніхто не вышле ліста з Ляўкова ў свет". Як тэкст Янкі Целушэцкага — больш лірычныя ўспаміны дзеля ўвекавечання паасобных імён, з якіх ужо шмат каго няма ў жывых, працу Мікалая Варанецкага „Нараўчанскія помнікі" можна было б назваць папулярна-навуковай, паколькі былы альхоўскі настаўнік прыводзіць у ёй шмат крыніц ды ўспамінаў іншых жыхароў Нараўчаншчыны з пачатку II сусветнай вайны, запісы якіх слоў зрабіў і сам аўтар. Прыводзіць таксама іншыя публікацыі, м.інш. „Белавежа ў цені свастыкі", „З Гайнаўскай зямлі" Барыса Нікіцюка. Пералічаны тут не толькі імёны герояў, бязвінных людзей якія паклалі галовы на роднай зямлі. Прыгадвае таксама моманты пацыфікацыі прыпушчанскіх вёсак фашыстамі, нараўчанскіх яўрэяў і ўспаміны пра іх гібель, імёны актывістаў КПЗБ, савецкай улады, момант вызвалення Нараўкі 20 ліпеня 1944 года, пасляваенны час, калі нараўчане гінулі з рукі польскага падполля. Хоць зборнічак невялічкі і можна сказаць навуковы, эмоцыі аўтара „ненавуковыя", што прыкмеціла вядучая сустрэчу. Бо і як жа быць абыякавым, пералічваючы трагічныя падзеі і імёны людзей, якія засталіся ў кароткай памяці сучаснікаў: „Цімафей Янюк, Аляксадр Саланевіч, Рыгор Зданоўскі, Мяфодзій Карпюк, Мікалай Філіновіч, Ян Ляшчынскі, Станіслаў Скаўронскі, Кастанцін Матысюк, Уладзімір Харкевіч, Цімафей Каролька, Аляксандр Валкавыцкі"... Сярод сядзеўшых на сустрэчы сяброў таварыства заварушыліся: маці сяброўкі была тады ў класе, калі „лясныя" выводзілі Аляксандра Валкавыцкага, дырэктара школы, вяжучы яго рукі калючым дротам, а калі енкнуў, што баліць яму пакалечаная далонь, на вачах вучняў білі яго па твары. Успамін настолькі запаў у перажыванні і памяць тадышніх дзяцей, што перадалі яго наступнікам. Ды запісанае застаецца назаўжды. Таму і Таварыства сяброў Нараўчанскай зямлі арганізуе агляды-конкурсы мемуарнай творчасці і заахвочвае наймалодшае пакаленне да таго, каб збірала па крышынцы сляды памяці. Трэба надзеяцца, што праз год больш актыўна ўключацца ў конкурс вучні школ імя Аляксандра Валкавыцкага і Тамары Саланевіч.

Мікалай Варанецкі (злева) і Янка Целушэцкі

ISSN 0546-1960